PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 41 (2474) Год XLVIII | Беласток, 12 кастрычніка 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Тое першае кастрычніка!

Мацей Халадоўскі

Замёр памежны гандаль. Здзейсніўся чорны сцэнарый аб змяншэнні ліку гандлюючых у Польшчы беларусаў — паведамлялі пасля поўдня некаторыя польскія тэлестанцыі ў дзень увядзення візавага рэжыму. Палякі з беластоцкага базара па вуліцы Юравецкай жартавалі: „Ну, гэты дзень можа аказацца днём святой... візы".

Ужо перад абедам першага кастрычніка на найбольш папулярным сярод беларускіх „турыстаў" базары па Юравецкай у Беластоку царыла пустэча. Не было чуваць гаманы з рускім акцэнтам: „Водка? Папяросы?!" На стаянцы таксі, дзе заўсёды на мур можна было купіць у беларусаў паўлітру гарэлкі парэчкавай ці „Панскі дом" за дзесятку, у найгоршым выпадку спірт у фольгавым мяшочку за пятак, цяпер сядзелі незнаёмыя заўсёднікам дзве немаладыя дамы.

Раніцай у цягніках Кузніца — Беласток, дзе раней было шмат беларусаў — многа пустых месцаў.

— Я ўпэўнена, што на працягу найбліжэйшых тыдняў усё вернецца да нормы, — заўважыла прэс-інфарматарка Падляшскай часці Памежнай службы Анна Валошын-Врона.

Па Юравецкай сярод палякаў запанавала паніка. Людзям здавалася, што кожны рослы мужчына гэта сышчык.

— Дзве пачкі чырвоных „North-star", — папрасіў цыгарэты адзін з пастаянных пакупнікоў.

— Няма. Нічога ў нас ужо няма. Усё раскупілі, — кінула толькі маладая польская бландзінка, якая стаіць тут, здаецца, „ад заўсёды".

— А даражэй будзе? — дапытваўся заўзяты курэц.

— Пабачым. Мабыць, будзе даражэй.

— Ну, дык па колькі будуць цыгарэты „North"?

— Па тры, можа, па тры пяцьдзесят! — і павярнула ў другі бок.

— O, kurczę! — сказаў сам сабе мужчына.

Дагэтуль славутыя цыгарэты „North" можна было набыць па 2,50 зл. Палякі з Юравецкай найчасцей бралі іх ад беларусаў на вакзале ў Кузніцы, альбо мелі дагавораныя „выкідышы", значыць, пасля пераезду мяжы перахоплівалі цыгарэты пасля таго, як выкідваліся цераз акно цягніка. Цяпер іх, можа, не будзе каму выкідваць.

Пасля першага кастрычніка на лавачцы каля стаянкі таксі ўжо нікога не было. На пляцоўцы стаяла адно аўто з беларускай рэгістрацыйнай табліцай. У глыбі, каля былой сядзібы Радыё „Рацыя", пры ўсходнім муры стадыёна спартклуба „Ягелонія" стаялі дзве жанчыны на выгляд каля пяцідзесяці гадоў.

[працяг ☞ 2]

Фота МІКОЛЫ ВАЎРАНЮКА

Жыхары Райска расказваюць пра пана, які казаў, што купіць іхнія гаспадаркі разам з імі. Пасярэдзіне Мікалай Семянюк

Хто будзе гаспадарыць у Гацьках і Райску?

Мікола Ваўранюк

— Зямлю забралі ў нашых бацькоў у час калектывізацыі, найлепшую, у найбольш зручным месцы, — кажа Аляксандр Коршак з Гацькоў. — Выглядае на тое, што мы яе ніколі не будзем рабіць.

Уладзімір Васілюк арэ і абсяваe зямлю сваю, матчыну і сястрыну. Разам 19 гектараў, параскіданых па кавалках. Калі ідзе сваім панадворкам, за плотам бачыць у адным кавалку 117 гектараў бяспанскай зямлі.

— Тое, што я маю, на сённяшні дзень, нішто, — гаворыць ён і паказвае за плот — вось, дзе мая перспектыва.

* * *

Трыста дваццаць гектараў зямлі ў Бельскай гміне між вёскамі Гацькі, Райск і Храбалы належалі Дзяржаўнаму сельскагаспадарчаму камбінату ў Бельску-Падляшскім, а калі той разваліўся, перайшлі пад Скарб дзяржавы. Агенцтва сельскагаспадарчай маёмасці ў Сувалках аб'явіла аўкцыён на дзесяцігадовую арэнду гэтага арэала.

Ёсць зямля, ёсць ахвотныя яе рабіць. У чым праблема? Чаму гаспадары з Гацькоў, Райска, Храбалоў баяцца прыняць удзел у аўкцыёне, паехаць у Сувалкі і не ўзяць сабе гэтыя гектары?

— Не маем ніякіх шанцаў, мы забедныя, — кажа Мікалай Семянюк з Райска, які трымае трыццаць свінаматак. — Да нас прыязджалі такія паны, якія гаварылі: купім усе вашы гаспадаркі разам з вамі.

— Гэты аўкцыён не на нашага гаспадара разлічаны, — кажа Уладзімір Васілюк. — Хто з нас можа ўзяць сто гектараў? Чаму ж не пабіць гэтае поле на меншыя дзялянкі, скажам па дваццаць гектараў?

— Няма такой практыкі дзяліць зямлю, якая ідзе пад арэнду, — тлумачыць Адам Крухэльскі з Агенцтва сельскагаспадарчай маёмасці ў Сувалках. — Гэта абцяжарвала б коштамі Скарб дзяржавы. Мы працуем у яго карысць і не можам дапусціць дадатковых выдаткаў.

Таму гэтая зямля была выстаўлена на аўкцыён раней выдзеленымі ўчасткамі: 11 га, 37,5 га ды 51,5 га каля Райска, 223 га ў граніцах трох вёсак: Храбалоў, Райска і Гацькоў. У межах тае апошняе — былая свінаферма. Пры чым, якраз за пустыя будынкі Агенцтва запатрабавала ўдвая большую арэндную плату — 500 цэнтнераў пшаніцы ў год — чымсьці за ворную зямлю (усяго 280 цэнтнераў). Стан гэтых будынкаў, мякка кажучы, нездавальняючы. Але нават, калі б яны былі ў надзвычай добрай кандыцыі — такая буйная гадоўля нікому з мясцовых не пад сілу.

Чатырох гаспадароў з Гацькоў: Уладзімір Васілюк, Яўген Казлоўскі, Аляксандр Коршак і Андрэй Мельнічук ахвотна ўзялі б у арэнду і падзялілі між сабою частку найбольшага зямельнага ўчастка — 117 гектараў, які ў межах гацькоўскіх палёў. Але паколькі такога падзелу не прадбачвалася, яны не падалі сваіх заявак на аўкцыён.

[працяг ☞ 3]

Экскурсія ў мінулае ☞ 3

Ініцыятыва арганізавання археалагічных раскопак каля Збуча выйшла ад Тадэуша Іванчука са Шлёнска, які купіў дом непадалёк ад гістарычнага месца. Пасля ініцыятыву пераняў войт Чыжоўскай гміны Юрый Васілюк. Рашыў ён арганізаваць фэст, каб гістарычнымі месцамі каля Збуча зацікавіць археалагічныя асяроддзі і музеі Польшчы.

На нямецкім памежжы ☞ 4

Зялёна-Гура — горад з вельмі прыгожым старым цэнтрам. Адрэстаўраваныя ў ім камяніцы, касцёлы і ўсе помнікі архітэктуры. Нідзе аднак няма інфармацыі, што сотнямі гадоў стваралі яго нямецкія архітэктары і будаўнікі.

Слава і багацце літаратурнай нівы Беласточчыны ☞ 5

Літаратура Беласточчыны не ўяўляе сабою чагосьці аднароднага. І гэтую яе асаблівасць выразна падкрэсліў Аляксандр Баршчэўскі, супрацьпаставіўшы творчыя пазіцыі Віктара Шведа і Надзеі Артымовіч, якая на беларускай глебе актыўна наследуе творчыя прынцыпы і мастацкія прыёмы польскіх мадэрністаў навейшага пакалення.

Белая вежа або Камянецкі стоўп ☞ 8

У сапраўднасці вежа — з чыронай цэглы, а сам Камянец сорак кіламетраў ад Белавежскай пушчы. Будынак вядомы таксама як *Камянецкая вежа* або *Камянецкі стоўп*. Яшчэ дзесяць гадоў назад вежа была размаляваная на белы колер. Супраць варварскай трактоўкі гістарычнага помніка пратэставалі мастакі і гісторыкі, і, дзякуючы ім, будынку вярнулі першапачатковы выгляд.

Канцавізна ☞ 9

Вёску Канцавізна ў мінулым заснавалі выхадцы з іншых падляшскіх вёсак — Зубава, Дзядковіч, Плютыч, — якія купілі землі ў месцы ранейшага маёнтка. У час рэлігійнай нецярпімасці праваслаўныя жыхары Канцавізны спазналі шмат гора з боку сваіх суседзяў, а апагеем разгулу шавінізму было спаленне вёскі бандай 2 лютага 1946 года.

Падляшша малаком плыве ☞ 11

На Падляшшы каля 60 тысяч гаспадарак займаецца прадукцыяй малака. Яно — лідэр у скупцы малака пералічваючы літр на гектар і на трэцім месцы па яго прадукцыі. У сярэднім адна 30-гектарная гаспадарка трымае 16 кароў і намерваецца пабольшыць гадоўлю.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Пасунуты саюз

Сярэдзіна верасня ў палітычным жыцці краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД) выявіла даволі цікавыя акалічнасці, якія даюць магчымасць спрагназіраваць далейшае развіццё стасункаў паміж былымі рэспублікамі Савецкага Саюза. І, па ўсім відаць, усё мацнейшы ўплыў на гэтае развіццё будзе аказваць Расія.

Увогуле адметнасцю Садружнасці ёсць існаванне на яе абшарах цэлага шэрагу міждзяржаўных утварэнняў, функцыі якіх папросту дубліруюцца. Да гэтага можна аднесці і Саюз Беларусі і Расіі, і Еўраазіяцкую эканамічную супольнасць, і рознага кшталту мытныя саюзы, і аб'яднанне ГУАМ (Грузія, Украіна, Арменія, Малдова), і гэтак далей. Сэнс існавання іхнімі стваральнікамі дэкларуецца як прыярытэт спрыяння эканамічнаму развіццю былых савецкіх рэспублік — наладжванню „разарваных" распадам СССР эканамічных сувязей, аблягчэнні ў перамяшчэнні людзей, тавараў і паслуг. Але калі глядзець звонку, то асаблівых поспехаў у дасягненні дэкларавaнай мэты ўбачыць цяжка. Хаця, канешне, распрацоўваюцца і рэалізуюцца ў рамках вышэйазначаных утварэнняў некаторыя эканамічныя праекты, але яны „не робяць пагоды" і новыя незалежныя дзяржавы ўсё больш аддаляюцца адзін ад аднаго як у эканамічным, так і палітычным плане. Тым самым ставячы пад сумненне сэнс існавання не толькі СНД, але і іншых „унутраных" міждзяржаўных арганізацый.

Яскравым прыкладам такога бессэнсоўя стаў Саюз Беларусі і Расіі, як нешта незразумелае, створанае ва ўгоду палітычных амбіцый беларускага кіраўніцтва і ельцынскага жадання своеасаблівай „рэабілітацыі" за падпісанне белавежскіх пагадненняў 1991 года, якія, па сутнасці, канстатавалі смерць СССР. Не ставячы пад сумненне гістарычную, культурную, эканамічную і нават духоўную еднасць абодвух народаў, з чаго выцякае так званае жаданне „жыць разам", прыходзіш да высновы, што пазіцыя цяперашняй беларускай улады ў большай ступені робіць усё, каб ускладніць такое жыццё.

Сустрэча беларускага і расійскага прэзідэнтаў 15 верасня ў прычанаморскім горадзе Сочы, які яшчэ называюць курортнай сталіцай Расіі, паказала, што за колішнімі завярэннямі афіцыйнага Мінска ў братняй славянскай любові да Расіі ў эканамічным плане стаіць жаданне атрымаць танную нафту і газ, прычым мала што рэальна даючы ўзамен і толькі абяцаючы ісці да цалкавітай эканамічнай інтэграцыі. Але калі такое было магчымае пры першым расійскім прэзідэнце, у якога нібыта існаваў „комплекс віны" за Віскулі-91, то для Пуціна падобных пачуццяў папросту не існуе. Таму ён выказвае на беларуска-расійскую інтэграцыю больш рэалістычны падыход, што грунтуецца на эканамічных інтарэсах расійскага бізнесу і расійскага капіталу, якія, па-першае, даюць магчымасць узмацнення расійскаму эканамічнаму ўплыву на постсавецкай прасторы, а, па-другое, спрыяюць палітычнаму ўплыву, што для менталітэту расіян, які многія не без падстаў называюць імперскім, вельмі важна.

Менавіта такая лінія прагледжваецца на саміце прэзідэнтаў краін СНД, што прайшоў амаль адразу пасля сочынскіх беларуска-расійскіх перамоў у крымскай Ялце. Менавіта там адбылося падпісанне дакументаў па стварэнні так званай Адзінай Эканамічнай Прасторы, куды на сённяшні дзень уваходзяць Беларусь, Казахстан, Расія і Украіна. Нягледзячы на тое, што ідэя такога аб'яднання належыць казахстанскаму боку, з асаблівым імпэтам да напаўнення рэальным зместам і выконвання ўсіх дамоўленасцей узяўся расійскі прэзідэнт. Ёсць меркаванне, што гэтага імпэту надае наяўнасць сярод падпісантаў Украіны, якая апошнім часам усё больш дэкларуе заходнюю эканамічную зацікаўленасць.

У гэтым рэчышчы пазіцыя Беларусі, а дакладней яе прэзідэнта, выглядае як накіраваная цалкам супраць вышэйазначаным інтарэсам Расіі. Блакіраванне ўвядзення расійскага рубля на тэрыторыі Беларусі, нежаданне прыватызацыі расіянамі „Белтрансгаза" і нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў прывялі да таго, што расійскі бок схіліўся да пераводу „братніх" адносін у грашовую плоскасць. Нібыта, каб не падштурхоўваць размовы хто каму больш вінававты, якія і без таго набылі моцнае гучанне ў беларускіх праўрадавых СМІ, галоўным эканамічным вынікам сочынскай сустрэчы стаў перавод аплаты Беларуссю расійскага газу па рынкавым кошце. Па рынкавым жа кошце аплачваць мусяць і расіяне Беларусі за транзіт „блакітнага паліва" ў Еўропу. Пастановай расійскага ўрада скасавана рэкамендацыя прадаваць газ беларускім братам па ўнутрырасійскім кошце, гэта значыць па 30 долараў за тысячу кубаметраў. Колькі ён будзе каштаваць пакуль невядома — вядуцца перамовы, але вядома, што расійскі „Газпрам" выставіў цану ў 80 долараў. Як беларуская дзяржава здолее аплаціць такі газ сказаць цяжка, бо і пры набыцці яго па ільготных цэнах за ёй застаўся доўг у больш за сотню мільёнаў долараў.

Выкажу меркаванне, што расійскі бок выцягне з беларускага прэзідэнта ўсё чаго хоча, бо апошняму папросту няма куды дзецца. Але ён, вобразна кажучы, са скуры лезе, каб дабіцца нечага свайго. На дзень напісання гэтага артыкула адбудзецца чарговая яго сустрэча з Пуціным у Маскве, дзе праходзяць Дні Беларусі.

Напярэдадні ў таварыскім хакейным матчы са зборнай маскоўскага гарадскога начальства, які завяршыўся нічыёй 5:5, Аляксандр Лукашэнка закінуў шайбу ў браму праціўніка. Але яна не была ўлічана — брама аказалася пасунутай. Штосьці ў такім выніку матча, як і ў ім самім вельмі нагадала беларуска-расійскі саюз.

Уладзімір Лапцэвіч

На мяжы цішыня. Поўная

Першым наступствам увядзення візавага рэжыму стала змяншэнне колькасці людзей, якія падарожнічаюць у Польшчу. На першы цягнік, які пасля ўвядзення візавага рэжыму адправіўся ў Польшчу было прададзена толькі 7 квіткоў. Звычайна на гэтым цягніку ехала да 500 чалавек. На аўтавакзале на першыя два „візавыя" рэйсы ў Польшчу прадалі адпаведна 2 і 3 квіткі. Пасля апошніх гарачых дзён дзейнічання ваўчэраў сёння на беларускай мяжы ціха і спакойна.

На чыгуначным вакзале знікла чарга ля пункту мытнага кантролю, да якой гродзенцы ўжо паспелі прызвычаіцца. Няма чаргі і ля касаў дзе прадаюцца білеты на замежныя рэйсы. Але адказныя асобы спадзяюцца, што ў хуткім часе сітуацыя выправіцца.

— Канешне, сёння абслугоўваючы рэйс, на якім едзе толькі 7 чалавек, мы нясем страты. Але гэта першы дзень і я думаю гэта хутка зменіцца. Калі не? Тады мы будзем вымушаныя адмяняць стратныя рэйсы, — гаворыць намеснік кіраўніка пасажырскага ўчастка гродзенскай чыгункі Лявон Лабко.

Падобнага пункту гледжання прытрымліваецца і кіраўніцтва аўтавакзала.

— Я спадзяюся, што гэта часовая з'ява. Першы дзень... Нехта праспаў, нехта забыў, нехта не паспеў зрабіць візу... Пакуль што ніводнага рэйса ў Польшчу мы адмяняць не збіраемся. Я думаю, з цягам часу сітуацыя нармалізуецца, — гаворыць Віктар Чыжык, дырэктар Гродзенскага аўтавакзала.

Гэтыя спадзяванні пацвярджае і колькасць візаў выдадзеная консульствамі Польшчы ў апошнім часе. Так на працягу толькі апошняга тыдня Генеральнае консульства Польшчы ў Гродне выдала каля 3000 візаў. Пры чым пераважная большасць з іх гэта шматразовыя візы.

Андрэй Адляніцкі
pahonia.promedia.by

Тое першае кастрычніка!

[1 ☞ працяг]

Эмоцыі ўзялі, мабыць, верх, бо адна з іх прамаўляла:

— Ужо няма гарэлкі, няма цыгарэт, няма нічога. Палякі ад раніцы бралі цыгарэты блокамі. Усё пайшло і ўсе паехалі.

Глянула на сяброўку:

— Мы ўжо не вернемся. Чакаем, вось, машыну. Зараз з мужам вяртаемся ў Гродна. А найгорш, што палякі не дазваляюць нам тут стаяць.

Забаранілі стаяць тут палякі — пастаянныя гандляры з Юравецкай. Для іх тых сорак пару злотых за аднакратную візу ці нават больш за дзвесце за шматразовую вернецца, можа, крыху пазней чым цяпер. Тут іх дом, тут харчуюцца. Білет у Гродна гэта няцэлыя два блокі цыгарэт „North". Рэшта — толькі рызыка. Для шмат якіх беларусаў, што гандлявалі да першага кастрычніка па Юравецкай, толькі тыя два блокі (10 — 14 долараў) гэта больш чым сацыяльная ўспамога.

Мацей Халадоўскі

Старшыня Савета Рэспублікі ў Польшчы

19 жніўня г.г. у рамках праграмы прабывання старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Генадзя Навіцкага ў Польшчы ў сувязі з удзелам у семінары па пытаннях мясцовага самакіравання, арганізаваным Офісам АБСЕ ў Мінску, Генадзь Навіцкі сустрэўся з пасламі Сейма і сенатарамі. У ходзе сустрэчы былі абмеркаваны перспектывы развіцця міжпарламенцкага супрацоўніцтва, у тым ліку ў рамках рабочых груп па супрацоўніцтве парламентаў Беларусі і Польшчы.

20 жніўня г.г. старшыня Савета Рэспублікі сустрэўся з маршалкам Падляшскага ваяводства Янушам Кшыжэўскім і членам Праўлення Падляшскага ваяводства, старшынёю БГКТ Янам Сычэўскім. У ходзе спаткання абмяркоўвалася праблематыка развіцця сістэмы мясцовага самакіравання ў Польшчы. Разглядаліся таксама пытанні рэалізацыі сумесных беларуска-польскіх ініцыятыў і праектаў у галіне трансгранічнага і міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, у тым ліку — у рамках еўрарэгіёнаў, становішча беларускай меншасці ў Польшчы.

У рамках прабывання ў Падляшскім ваяводстве Генадзь Навіцкі наведаў прадпрыемства „Пронар" у Нарве, дзе збіраюцца беларускія трактары. У ходзе сустрэчы з дырэктарам „Пронару" Сяргеем Мартынюком абмяркоўваліся пытанні далейшага развіцця вытворча-аперацыйных сувязей з беларускімі прадпрыемствамі.

(www.mfa.gov.by)

Не абражайце памяць Васіля Быкава!

Тэкст мемарыяльнай дошкі Васілю Быкаву, зацверджаны яшчэ ўлетку гродзенскім гарвыканкамам, выклікаў абурэнне ў пісьменніцкім асяроддзі. Беларускі ПЭН-цэнтр вырашыў накіраваць у гродзенскі гарвыканкам пратэстны ліст, каб прадухіліць абразу памяці народнага пісьменніка Беларусі.

Мемарыяльную дошку маюць устанавіць на доме № 9 па вуліцы Парыжскай Камуны, дзе знаходзілася апошняя гродзенская кватэра Васіля Быкава. Улады (заўсёды чужыя і варожыя пісьменніку) імкнуцца ўсімі сродкамі прысабечыць ягоную славу. Таму ў тэксце выпячваюцца словы „Герой Социалистического Труда, лауреат Ленинской і Государственных премий". На думку старшыні Беларускага ПЭН-цэнтра Лявона Баршчэўскага, гэта тыпова савецкая фразеалогія прамінулай бальшавіцкай эпохі. І ў цяперашняй сітуацыі яна не ўзвышае і не ўшаноўвае памяць Васіля Быкава, а наадварот, абражае і прыніжае.

Пакуль скульптар Уладзімір Панцялеяў не ўзяўся за выкананне дошкі (а менавіта ён яе мае зрабіць), абразлівы тэкст яшчэ не позна змяніць на больш прыстойны і годны памяці Васіля Быкава. Можна напісаць проста і зразумела: „Тут жыў і працаваў (даты) Народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў".

Раман Доўгерт

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Работнікі Археалагічнага дзяржаўнага музея з Варшавы пры выплаўцы жалеза

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Рыцары з Вроцлава

Экскурсія ў мінулае

Археалагічны фэст спалучаны з развітаннем з летам, які 28 верасня наладзілі каля Збуча войт Чыжоўскай гміны і Асяродак аховы археалагічнай спадчыны з Варшавы, перарос спадзяванні арганізатараў і сабраў шматлікую публіку. Вялікая стаянка пры дарозе ў Бельск-Падляшскі шчыльна запоўнілася машынамі і аўтобусамі. На мерапрыемства прыбылі не толькі жыхары Чыжоўскай гміны і навакольных вёсак. Пазнаёміцца з жыццём у сярэдневякоўі прыехалі вясковыя выхадцы — жыхары Гайнаўкі, Бельска і Беластока.

Абведзенае насыпам месца старажытнага гарадзішча з'яўляецца зараз уласнасцю гміны. Яшчэ нядаўна пасвіліся на ім каровы і авечкі збучанскіх гаспадароў. Ініцыятыва арганізавання археалагічных раскопак каля Збуча выйшла ад Тадэуша Іванчука са Шлёнска, які купіў дом непадалёк ад гістарычнага месца. Пасля ініцыятыву пераняў войт Чыжоўскай гміны Юрый Васілюк. Рашыў ён арганізаваць фэст, каб гістарычнымі месцамі каля Збуча зацікавіць археалагічныя асяроддзі і музеі Польшчы. Удалося яму гэта зрабіць, бо адгукнуліся археолагі з Варшавы і Гданьска.

— На гэтым месцы ў раннім сярэдневякоўі знаходзіўся ўмацаваны горад. Насып вакол яго выкананы быў з зямлі, каменя і драўніны, — заявіў Марэк Герляк, дырэктар Асяродка аховы археалагічнай спадчыны з Варшавы. — У наступным годзе праведзены будуць уступныя раскопкі курганных могілак, што знаходзяцца непадалёк ад умацаванняў і будуць вывучаны курганы. Прадбачваецца выданне турыстычнага даведніка аб гістарычных месцах каля Збуча.

— Фэст наш расслаўляе на ўсю Польшчу Збуч, нашу гміну і Гайнаўскі павет. Госці, якія да нас прыехалі, у наступным годзе хочуць успамагчы археалагічныя раскопкі. У ліпені наступнага года плануем наладзіць чарговы фэст, а ў будучыні выканаем рэканструкцыю ўмацаванага горада з абарончым ровам вакол яго, — сказаў войт Чыжоўскай гміны Юрый Васілюк.

Археалагічны фэст арганізаваўся ў рамках святкаванняў Еўрапейскіх дзён спадчыны і таму можа знайсці водгук у еўрапейскіх краінах.

Мерапрыемства распачалося з музычнага фэсту. Перад публікай спявалі і танцавалі вучні з Комплексу школ у Чыжах і Падставовай школы ў Кленіках. Пасля з беларускімі песнямі выступілі калектывы „Чыжавяне", „Незабудкі" з Курашава, „Збучанкі", „Васілёчкі" з Бельска і „Лучына" з Беластока. Ужо падчас музычнага фэсту, які быў развітаннем з летам, можна было наведаць палаткі археалагічных музеяў і паглядзець на „славянскіх рыцараў", якія прыехалі з Вроцлава і Торуні. Працаўнікі Археалагічнага дзяржаўнага музея з Варшавы паказвалі як у сярэдневякоўі выплаўлялася жалеза. У іх палатцы можна было пабачыць „дымарку" — печ для выплаўкі жалеза, збудаваную паводле сярэдневяковых узораў. Жалезную руду прывезлі з Белавежскай пушчы, каб умовы працы былі падобнымі да тых, якія былі на нашых землях у мінулым. Работнікі дзьмухалі на драўняны вугаль у „дымарцы", разагараючы руду да 1 200 градусаў. Не паспеў я спраўдзіць ці з вокісаў жалеза атрымалася чыстае жалеза, бо печ працавала адно 5 гадзін. Жалеза з дымарак у мінулым апрацоўвалі кавалі. На фэсце гайнаўскі каваль Станіслаў Мяжвінскі са сваімі памочнікамі кавалі падковы і цвікі і раздавалі іх госцям мерапрыемства.

— Не ведаем ці паспяхова закончыцца наш эксперымент, бо ў сярэдневякоўі працэс выплаўкі жалеза працягваўся суткі, а ў нас такі кароткі тэрмін, — заявіў працаўнік Археалагічнага дзяржаўнага музея з Варшавы Уладыслаў Вэкер. — Папярэднія доследы сведчаць, што ўмацаваны горад узнік тут у XIII стагоддзі. За ўмацаваннямі ў мінулым магло хавацца насельніцтва навакольных сяліб у час прыходу варожых войск. Тэрыторыя абгароджаная насыпамі была даволі вялікай і ўмацаваны горад мог быць больш развітым. Маглі прабываць у ім пастаянныя жыхары.

Збоку „дымаркі" стаялі работнікі Археалагічнага музея з Гданьска, якія, карыстаючыся спосабам апрацаваным раннімі славянамі, выплаўлялі з бярозавай кары дзёгаць. Дзяўчына ўручную выконвала гліняныя гаршкі.

Частка публікі згуртавалася побач палатак славянскіх рыцараў, якія рыхтаваліся да паказу вайсковых умеласцей. Памагалі ім дзяўчаты, апранутыя ў сярэдневяковую вопратку. „Дружына сленжанскіх вояў" з Вроцлава паказала рыцарскія змаганні з прымяненнем мячоў, тапароў, чаканаў і шчытоў. Грукат зброі адстрашыў наймалодшых, але зацікавіў моладзь і мужчын. Увагу жанчын прыцягнулі крамы з народнымі і стылізаванымі на старадаўнія вырабамі. Можна было купіць жаночыя ўпрыгожанні, вопратку і гістарычныя кніжкі. Свае экспазіцыі падрыхтавалі Цэнтр грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь і Беларускае гістарычнае таварыства (можна было купіць беларускія гістарычныя выданні). Прапанавалася даўняя кухня і піва. Напітак, які ведалі ўжо ў сярэдневякоўі, прыцягнуў мужчын. Каб заняць дзяцей, арганізаваліся ім конкурсы і гульні. Адважныя дазвалялі, каб шнуравалі іх у калодкі. Гульні перапляталіся са змаганнямі рыцараў з Торуні. „Дружына славянскіх вояў" з гэтага горада паказала ўборы і зброю X-XI стагоддзяў.

— Цікавае атрымалася мерапрыемства і варта яго арганізаваць у будучыні. У нас расказвалі, што нешта было тут у мінулым, — сказаў Яраслаў Бялькевіч з Чыжоў.

Вечарам удзельнікі фэсту адпачывалі каля вогнішча, а моладзь гуляла. Жыхары Чыжоўскай гміны ў асноўным лічаць сябе беларусамі. Актыўна падтрымалі яны на апошніх самаўрадавых выбарах Беларускі народна-выбарчы камітэт і масава ўдзельнічаюць у беларускіх мерапрыемствах. Можна на падставе раскопак і дакладнага даследавання знойдзеных прадметаў можна будзе даведацца, адкуль прыйшлі жыхары ўмацаванага гарадзішча.

Аляксей Мароз

Хто будзе гаспадарыць...

[1 ☞ працяг]

Жыхары Райска такія заяўкі на меншыя дзялянкі падалі, нягледзячы на тое, што Агенцтва адмоўна паставілася да іх прапановы, каб аўкцыён абмежаваць адно да трох найбліжэйшых вёсак: Райска, Гацькоў і Храбалоў. У Сувалках тлумачыліся законамі і пастанавілі: у аўкцыёне могуць прымаць удзел жыхары Бельскай гміны ды суседніх, калі маюць хоць адзін участак на тэрыторыі Бельскай. На практыцы да аўкцыёна былі дапушчаны жыхары дзесяці гмін.

Аўкцыён прайшоў 23 верасня ў Сувалках. Разглядаліся ў ім трынаццаць прапаноў. Тры меншыя ўчасткі — так як прадбачылі жыхары Райска, якія ўдзельнічалі ў аўкцыёне — на дзесяць гадоў трапілі ў рукі нетутэйшых гаспадароў. Аўкцыён на найбольшы ўчастак быў адтэрмінаваны. Не таму, аднак, што не было ахвотных на гэтую зямлю. А таму, што, як сказаў адзін з зацікаўленых, умяшалася якоесьці халернае таварыства „Гай".

* * *

Таварыства „Гай" у 1999 годзе заснавалі жыхары Гацькоў з мэтай „усебаковага развіцця мясцовай грамадскасці, пры захаванні мясцовых асаблівасцей: прыроды, краявіду і культуры". На такі пачын натхніў іх „замак" — курган, у якім археолагі знайшлі сляды пасяленняў з другога стагоддзя да нашай эры. Таварыства збірала смецце на „замку", інтэрвеніравала супраць высечкі дрэў у яго наваколлі, дамагалася ясных крытэрыяў аховы гэтага месца. Замест таго даведалася, што ўчастак зямлі з „замкам" — 40 гектараў — арандуе жыхар Вышкоўскай гміны. Мясцовых ніхто пра такую магчымасць нават не паінфармаваў.

Таварыства „Гай" дабілася хаця таго, што Ваяводскі рэстаўратар прыроды ў Беластоку 12 чэрвеня гэтага года выслаў Гміннай управе ў Бельску-Падляшскім пісьмо з інфармацыяй: „Камавы ўзгорак на ўчастку зямлі № 200 у Гацьках, рашэннем беластоцкага ваяводы № 3/94 ад 17 лістапада 1994 года, быў прызнаны помнікам прыроды". Пасля гэтага пачаліся працы па стварэнні прыродна-краявіднага комплексу. А карысталь-нік зямлі вакол кургана абавязаны так гаспадарыць, каб не пашкодзіць унікальнага краявіду. А унікальны ён не адно дзякуючы археалагічным вартасцям, але таксама эндэмічным раслінам.

Найбольшы ўчастак зямлі, які выстаўляўся на аўкцыён 23 верасня — па-суседску з гэтым помнікам археалогіі і прыроды. У планах добраўпарадкавання Бельскай гміны — павінен ён быць выкарыстаны ў сельскай гаспадарцы. Паколькі разам з ім (і ўдвая даражэй) выстаўляліся на арэнду свінарнікі, дык будучыня сельскай гаспадаркі тут выглядае даволі адназначна.

Самім гацькоўцам тая свінаферма непатрэбная. Дзякуючы актыўнасці таварыства „Гай" — акцыі прыбірання наваколля кургана, канферэнцыям і спатканням з навукоўцамі — жыхары Гацькоў сваю будучыню хутчэй звязваюць з экалагічна чыстай сельскай гаспадаркай, агратурызмам.

— Ахова прыроды не супярэчыць традыцыйнай сельскай гаспадарцы, — пераконвае старшыня таварыства „Гай" Янка Мордань. — У найбліжэйшым акружэнні кургана маглі б пасвіцца коні, каровы, авечкі ці козы. Крыху далей можна было б зямлю араць, але без інтэнсіўнага штучнага ўгнаення. А хто лепш будзе дбаць пра гэтую зямлю, як не людзі, якія кроўна з ёю звязаны на працягу стагоддзяў?

* * *

Аўкцыён на арэнду зямлі між Гацькамі, Райскам і Храбаламі праходзіў згодна з законам. Паказаў, што мясцовыя гаспадары не маюць шанцаў выйграць ва ўмовах ліберальнай эканомікі з прыезджымі землеўладальнікамі.

Другая выснова больш аптымістычная. Таварыства „Гай" паказала, што варта людзям яднацца вакол супольных спраў. І варта памятаць, што „не адным хлебам" чалавек жыве. У нашым штодзённым змаганні за тую лусту з маслам, аказваецца, дапамагчы могуць веды пра, здавалася б, нематэрыяльную спадчыну.

Невядома пакуль, як складзецца лёс гэтай зямлі. Жыхары Райска выслалі петыцыю з патрабаваннем прызнаць няважнымі вынікі аўкцыёна на меншыя яе ўчасткі. Кіраўніцтва Агенцтва сельскагаспадарчай маёмасці з Сувалкаў прыедзе ў Бельск на перамовы з мясцовымі гаспадарамі. Памагла б ім моцная, адназначная падтрымка Бельскай гміны.

Мікола Ваўранюк

На нямецкім памежжы

Пражываючы на Беласточчыне, праблемы памежжа часта бачацца нам у кантэксце беларуска-польскіх адносін. Часам нешта можна яшчэ ў нас пачуць пра літоўцаў і ўкраінцаў, а недзе, не цалкам далёка, відаць яшчэ цень вялікай Расіі. На другім баку Польшчы раскінуліся землі, якія да 1945 г. знаходзіліся ў межах Нямеччыны. Цяпер за ракой Одрай — саюзная дзяржава, партнёр Польшчы ў НАТА і Еўрасаюзе. Дыпламаты абедзвюх краін перад тэлекамерамі гавораць пра сяброўскія адносіны, паразуменне, прабачэнне ўзаемных крыўдаў. Хапае аднак пераехаць межы былога III Рэйха і зразу адчуваецца атмасфера змагання палякаў за заходнія крэсы.

З вокнаў цягніка па маршруту Познань — Зялёна-Гура відаць яшчэ рэшткі нямецкай інфраструктуры. Старыя муры з чырвонай цэглы ў большасці закрытыя ўжо шматколернымі тынкамі, каменныя дарогі і сцяжынкі — пліткамі „польбруку". У краявідзе дамінуюць новаўзведзеныя будынкі паводле ўзораў з камп'ютэрных каталогаў. Дакладна такія ж узнікаюць вакол Беластока. Толькі вакзалы, з-за недахопу дзяржаўных сродкаў на інвестыцыі ў чыгунку, выглядаюць як на архіўных фільмах пра II сусветную вайну.

Зялёна-Гура — горад з вельмі прыгожым старым цэнтрам. Адрэстаўрываныя ў ім камяніцы, касцёлы і ўсе помнікі архітэктуры. Нідзе аднак няма інфармацыі, што сотнямі гадоў стваралі іх нямецкія архітэктары і будаўнікі. Асабліва прэзентуюцца арнаменты з выявамі белага арла на неагатычных камяніцах. Не надта натуральна выглядаюць таксама барочныя алтары ў былых пратэстанцкіх касцёлах.

Эканоміка, аднак, прымушае ўлічваць блізкую прысутнасць нямецкага фактара. Вялікія надпісы на нямецкай мове на прыватных кватэрах інфармуюць пра свабодныя месцы для начлегу. На той жа мове напісанае таксама меню ў рэстаранах, а ў нямецкіх супермаркетах, што амаль у цэнтры горада, купляюць мясцовыя патрыёты, бо там, як самі гавораць, нашмат танней, чым у іншых крамах.

Атмасфера змагання за заходнія крэсы адчуваецца таксама падчас навуковых канферэнцый. Нялёгкую працу маюць мясцовыя гісторыкі. Пісаць сумленна гісторыю тае зямлі XV ці XIX стагоддзя — гэта вяртаць памяць аб нямецкай прысутнасці. Дарэчы, мясцовым жыхарам нават цяпер вельмі цяжка акрэсліць сваю тоеснасць. Жывуць там палякі з Заходняй Украіны, выселеныя пасля 1944 г., украінцы і лэмкі з паўднёва-ўсходніх ваяводстваў Польшчы выселеныя падчас акцыі „Вісла", пазнанякі, варшавякі, кракавякі. Амаль няма людзей, якія маглі б сказаць: „Тут зямля, дом майго прадзеда". Мясцовая актывістка, доктар гісторыі з эндэцкімі поглядамі, прапагандуе супольнае званне для ўсіх — „любушане", якое вяртала б памяць старажытнай славянскай правінцыі. Аднак бяшчадскія лэмкі, як зразумеў я іх выказванні, не адчуваюць ніякай сувязі з мясцовымі даўнімі плямёнамі.

Артыстычныя ўражанні ўдзельнікам канферэнцыі дастаўляў калектыў, які працягвае традыцыю горцаў з Татранскай Букавіны. Гэта таксама перасяленцы, палякі з румынска-ўкраінскага памежжа. Карпацкія напевы і народная вопратка прэзентуюцца ў Зялёнай-Гуры так, як кракаўскі фальклор у Чыкага. Ніхто не ведае мясцовага фальклору з-за адсутнасці карэннага насельніцтва, а IX-вечныя традыцыі з эпохі любушанаў можна толькі пабачыць у навейшым фільме Ежы Гофмана.

На захадзе Польшчы таксама цяжка сустрэць каго-небудзь, хто адкрыта акрэсліць сябе немцам, так як у Беластоку — беларусам. Аднак у размовах з мясцовымі жыхарамі адчуваецца занепакоенасць перспектывай адкрытых межаў з Нямеччынай. Хаця нідзе не відаць немцаў, але ў размовах з мясцовым насельніцтвам адчуваецца іх прысутнасць. Вяртаюцца быццам у нематэрыяльным вымярэнні. Магчыма, што страх сярод палякаў выклікае актыўнасць нямецкіх фірмаў, якія займаюць штораз большую прастору ў мясцовай эканоміцы. „Нам астанецца неўзабаве толькі абслугоўваць кухні ў гатэлях і рэстаранах, ды яшчэ прыбіраць пасля немцаў", — сказала барменка ў рэстаране, які з'яўляецца ўласнасцю нямецкай суполкі.

Яўген Мірановіч

Бярыцеся за справу

Калі так ездзіў я веласіпедам па гмінных дарогах і вёсках Гайнаўшчыны, дык меў уражанне, што крызіс вёскі, прынамсі той, якую я бачыў, не дасягае. Аблогаў са свечкай шукаць. Лугі зялёныя, палі абсеяны. Значыць, так і трэба. А ў вёсках хаты — не хаты, проста шыкарныя дачы, двухпавярховыя, а на кожным панадворку, толькі дзе-нідзе „малы фіят", а то пераважна заграніччная машына. Жніво не цягнулася, як калісьці, тыднямі — некалькі дзён і па жніве. Пэўна, работа кругом, але добра, што ёсць, не то што ў горадзе, дзе замыкаюць заводы адзін за адным. Аўтакрама давязе і хлеб, і муку, мяса ды макароны. Заварыш вады, сыпнеш у гаршчок быстрасуп, і страва гатова. У такі гарачы час, які быў сёлета, не трэба было стаяць гадзінамі пры кухні, каб накарміць сям'ю. Мала таго, чытаю ў „Ніве" ад 24 жніўня 2003 года („Селянін, што далей?"), што „сяляне ад будучага года і праз наступныя два гады змогуць карыстацца гэтак званай структурнай дапамогай Еўрасаюза". І так, на пабудову або рамонт гаспадарчых будынкаў, закупку машын для земляробства, закупку зямлі і жывёлы можна атрымаць не больш чым 160 тысяч зл. А ў рамках Праграмы аднаўлення вёскі (ой, прыдалася б шыкарная сетка асфальтавых дарог, нават між палямі) можна атрымаць 450 тысяч зл. пры ўмове, што гэтыя грошы могуць атрымаць тыя сяляне, якія самі пішуць праекты. Дапамога, чытаю, будзе таксама ахопліваць разбудову і адаптацыю жылля і гаспадарчых будынкаў на агратурыстычныя мэты і іх абсталяванне. Разам на гэта можна атрымаць нават і 100 тысяч злотых. Чытаю далей, што на мадэрнізацыю ўнутраных дарог, напрыклад, з Махнатага ў Дубічы-Асочныя, і з Махнатага ў Барок можна атрымаць да 200 тысяч зл. Шкада, што аўтар допісу „Селянін, што далей ?" не падаў інтэрнэтавага адраса Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі.

Дарагія дзеячы розных арганізацый, радныя, солтысы, войты, бярыцеся за справу. Як кажуць, грошы ляжаць на вуліцы, не на вуліцы, але ў Еўрасаюзе. Трэба толькі ўмела іх узяць.

Міхал Куптэль

Вачыма паляка

Сказаў, што ведаў?

Польскія медыя абабегла справаздача з пабыўкі на Беларусі дэпутата ад Уніі працы, былога маршалка Сейма Аляксандра Малахоўскага. Прабываў ён там як член дэлегацыі Савета Еўропы, якая мела там праверыць, як выконваюцца грамадзянскія правы. А ўсё ў сувязі з заявай Беларусі вярнуць ёй статус адмыслова запрошанай пры Савеце Еўропы. Аляксандр Малахоўскі даў запрасіць сябе беларускімі ўладамі на экскурсію па Мінску і ваколіцы. У час завяршаючага пабыўку спаткання з дыпламатычным корпусам акрэдытаваным у Мінску і прэс-канферэнцыі меў ён сцвердзіць, што апазіцыя ў Беларусі не адыгрывае практычна ніякай ролі, Беларусь гэта краіна людзей задаволеных і добра апранутых, Мінск адноўлены і ў Беларусі лепш чым у Польшчы, у кантэксце адносна нізкага беспрацоўя, а з перспектывы ягонага лагернага досведу пазітыўна ацэньвае перамены ў Беларусі.

Цытавалі Малахоўскага дзяржаўныя медыя, а віншаванні за выступленне атрымаў ён м.інш. ад пасла Расіі. Абразіўся затое на яго пасол Вялікабрытаніі, які меў выразіць абурэнне і дэманстратыўна выйсці з сустрэчы. „Rzeczpospolita", якая першая падала гэтыя інфармацыі, выказванні Аляксандра Малахоўскага прыводзіць за іншым удзельнікам паездкі ў Мінск, дэпутатам Багданам Кліхам з Грамадзянскай платформы — апазіцыйнай партыі да будучай пры ўладзе Уніі працы. Сам „герой" прэсавых пераказаў таксама тлумачыўся перад журналістам „Rzeczpospolitej". Заявіў м.інш.: „Я асабіста прабаваў прадставіць Беларусі канкрэтныя тэрміны на рэалізацыю прапаноў Савета Еўропы, адчыніць брамку і гэтай дарогай уплываць на змены" ды „я хацеў пабачыць, як Беларусь сапраўды выглядае. Бо агляданне Мінска і размова з апазіцыяй нічому не служаць. А на правінцыі ёсць рэчы вартыя захаплення і зайздрасці. Наколькі гэта напаказ, таго не магу сказаць".

Шкадобу, што Малахоўскі не сустрэўся з прадстаўнікамі апазіцыі, незалежных медыяў ці няўрадавых арганізацый выказаў зараз жа Яраслаў Раманчук з Аб'яднанай грамадзянскай партыі, які, дарэчы, мае прадстаўляць становішча пяці апазіцыйных партый на найбліжэйшай сесіі Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы ў Страсбургу, незалежна ад афіцыйнай дэлегацыі беларускага парламента. Зараз жа ў Радыё „Палёнія" іншы дэлегат на сесію ПАСЕ Вінцук Вячорка, лідэр Беларускага народнага фронту сказаў, што дэпутат Малахоўскі, насуперак ягоным перакананням і цытуючы даслоўна сказаў „пазіцыя апазіцыі надзвычай слабая", а не так, як прывёў Кліх, „не адыгрывае ніякай ролі". Можа быць, значыць гэта тое ж самае.

Вядома, тэму падхапіла мясцовая прэса. Не здзіўляе гэта, тым больш, што Малахоўскі быў у другой палове дзевяностых дэпутатам ад Беласточчыны. На старонках „Кур'ера паранага" адважнымі палічыў мінскія выказванні дэпутата яго кааліцыйны калега Яўген Чыквін, падляшскі дэпутат ад СЛД, галоўны рэдактар „Przeglądu Prawosławnego". Гэта нагода, аднак, на маю думку, не да дыскусіі над еўрапейска-польска-беларускімі дылемамі, а хутчэй беластоцка-беластоцкімі.

Не ўдалося мне паразмаўляць пасля прыезду з Мінска са спадаром маршалкам. Быў ён у Парыжы і меў выключаны мабільны тэлефон. Паводле мяне, аднак, а ведаю Аляксандра Малахоўскага ледзь не ад дзяцінства (вядома, майго), што яго паводзіны і выказванні ў Мінску звязаны былі з тым, што ўбачыў, хацеў убачыць або што яму паказалі ці сказалі. З ранейшых размоў з Аляксандрам Малахоўскім аб беларускіх праблемах мне вядома, што ён прыхільнік аптацыі, якая прапаведвае: нельга Беларусь выкідаць па-за абсяг дэмакратычнага свету, асуджаць на нябыт краіну распаложаную амаль у цэнтры Еўропы толькі з тае прычыны, што кіруе ёю адміністрацыя называная рэжымнай; трэба яе пераконваць, а не ваяваць з ёю. Дэпутат Малахоўскі, мабыць, быў упэўнены, што дэпутат Кліх сустрэнецца з апазіцыяй, значыць, ён, як другі прадстаўнік мяжуючай з Беларуссю Польшчы ў Савеце Еўропы, захавае раўнавагу і паддасца „праграме" прапанаванай беларускімі гаспадарамі. Той раўнавазе, а, значыць, пошукам таксама кампрамісу мае служыць запрашэнне на сесію ПАСЕ дзвюх беларускіх дэлегацый (афіцыйнай і апазіцыйнай).

Ведаю таксама, як часта спадар Малахоўскі стараецца быць шчыры, паводле прынцыпу: што бачу, тое і думаю і зараз жа скажу. Няраз, дарэчы, у сувязі з гэтым нават з сеймавай трыбуны выходзілі з яго вуснаў словы, якія гучалі інакш чым задумаў, бо іх кантэкст быў шырэйшы ад задуманага аўтарам. Так, як у Мінску тлумачыўся зараз жа пасля абурэння брытанскага пасла, што казаў пра тое, што няма прысутнасці апазіцыі ў парламенце, а не ўвогуле.

Да таго ў адносінах да Беларусі цяжкай ёсць роля члена дэлегацыі Савета Еўропы, які выводзіцца з Польшчы. Значна цяжэйшая, чым роля, скажам, брытанца. З гэтае пазіцыі тупанне на Беларусь і то ў Мінску „ботам у трыбуну" (падобна як Мікіта Хрушчоў) не служыць інтарэсу Польшчы і можа будаваць штораз шчыльнейшы мур паміж нашымі краінамі. У першую чаргу неабходным ёсць перакананне мінскай адміністрацыі аб неабходнасці вытлумачэння, што сталася з таямніча прапаўшымі асобамі, каб увяла еўрапейскія прынцыпы вольнага слова і адмяніла смяротнае пакаранне. Гэта падставовыя ўмовы паўторнага надання Беларусі статуса адмыслова запрошанай пры Савеце Еўропы. Да таго, дарэчы, прадстаўнікоў апазіцыі Беларусі не мусіць пераконваць ніхто з членаў Савета Еўропы. Да таго ёсць неабходным, каб „тамтэйшы" бок хацеў увогуле слухаць. Каб захацеў, нельга заігрываць да яго ў хрушчоўскім стылі. І наадварот. Толькі ёсць яшчэ адно пытанне, ці на сёння Савету Еўропы патрэбны такі госць? Можа, таму госцю больш патрэбны Савет Еўропы. А Польшчы?

Мацей Халадоўскі

Слава і багацце літаратурнай нівы Беласточчыны

Дзіўныя бываюць заканамернасці гісторыі. У XIX і ў пачатку XX стагоддзя асноўным цэнтрам, у якім адраджалася беларуская нацыянальная свядомасць, станавілася сталіца колішняга беларускамоўнага Вялікага княства Літоўскага Вільня. Тут жыў „бацька беларускага адраджэння" Францішак Багушэвіч. І тут пад уздзеяннем падзей рэвалюцыі 1905-1907 гг., а ў 1919-1920 гг. выходзілі газеты „Незалежная Беларусь", „Беларуская думка", „Наша думка", „Незалежная думка". У міжваенны перыяд з Вільні выпраменьвала беларушчына на ўсю Заходнюю Беларусь.

Другая сусветная вайна паклала канец гэтаму працэсу. Спрадвечная Вільня ператварылася ў Вільнюс, а ўлады Савецкай Літвы спынілі беларусізацыю сталіцы, велікадушна ахвяраванай ім у свой час Сталіным. Быў, у прыватнасці, ліквідаваны Музей імя Івана Луцкевіча, і на працягу кароткага часу наступіла тут агонія беларушчыны. Затое ж яна за межамі Беларусі зарадзілася і небывала шырока разгарнулася ў іншым месцы — у Беластоку і на Беласточчыне.

Феномен беларускага літаратурнага руху на Беласточчыне дачакаўся першых цікавых і змястоўных публікацый. Сярод іх вылучаюцца кніжка Георгія Валкавыцкага „Віры", зборнік „Беларускія пісьменнікі Польшчы", апублікаваны ў серыі „Беларускі кнігазбор", а ў 2001 годзе з'явілася ў Мінску салідная манаграфія прафесара Аляксандра Баршчэўскага, загадчыка Кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта, „Творцы беларускага літаратурнага руху ў Польшчы. 1958-1998". Яна заслугоўвае асаблівай увагі і паслужыць многім пакаленням даследчыкаў надзейным арыенцірам у пошуках заканамернасцей літаратурнага працэсу на Беласточчыне.

Нашаму чытачу, бясспрэчна, цікава будзе пазнаёміцца з каштоўнай інфармацыяй, якая падаецца ва ўводзінах. Тут паведамляюцца звесткі пра асноўныя этапы разгортвання беларускага культурнага жыцця ў пасляваеннай Польшчы і найбольш істотныя здзяйсненні, якія трывала — гэта можна сцвярджаць з усёй упэўненасцю — увойдуць у гісторыю і ўсё больш высока будуць цаніцца з кожным новым пакаленнем даследчыкаў, зацікаўленых лёсам беларускага народа, беларускай нацыянальнай ідэі, беларушчыны. Вельмі істотнае значэнне мела палітыка дзяржавы, якая на нейкім этапе прызнала існаванне нацыянальных меншасцей у Польшчы, дазволіла ім ствараць грамадска-культурныя таварыствы і выдзеліла фінансавыя сродкі для іх падтрымкі, садзейнічала выдаванню перыядычных органаў і публікацыі кніг. На гэтай хвалі ў пачатку 1956 г. у Беластоку ўзнікла Беларускае грамадска-культурнае таварыства (БГКТ), пачалі выходзіць тыднёвік „Ніва", „Беларускія календары", зборнікі мастацкіх твораў. На старонках гэтых выданняў з таго часу з'яўляюцца вершы, апавяданні, публіцыстычныя артыкулы, нарысы мясцовых аўтараў.

Зусім справядліва аўтар манаграфіі падкрэслівае асаблівую ролю ў гэтым працэсе Георгія Валкавыцкага, шматгадовага рэдактара „Нівы", аўтара мастацкіх твораў, якія падпісваў псеўданімам Юрка Зубрыцкі. У сярэдзіне 1958 года было створана беларускае літаратурнае аб'яднанне, якое стала называцца „Белавежа". Першапачаткова ўзначальваў яго Георгій Валкавыцкі, а праз два гады — Аляксандр Баршчэўскі.

Белавежцы вельмі актыўна сустракаюцца з зацікаўленымі чытачамі. Адзін Віктар Швед правёў больш за 1 200 такіх сустрэч, сам Аляксандр Баршчэўскі — больш за 1 000. Многія дзесяткі і сотні тысяч школьнікаў і дарослых адчулі радасць сустрэч з жывымі аўтарамі, творы якіх даходзілі і даходзяць да іх у шматлікіх выданнях. Такога яшчэ не было на беларускай зямлі. Гэта — небывала дзейсны сродак барацьбы з нацыянальным нігілізмам, з абыякавымі ці нават пагардлівымі адносінамі да родных вытокаў у нейкай часткі выхадцаў з беларускай вёскі. Бо і такую з'яву засведчыла мастацкая літаратура, публіцыстыка, газетныя рэпартажы, даючы ёй адпаведную заслужаную ацэнку.

У манаграфіі Аляксандра Баршчэўскага разглядаецца жыццёвы і творчы шлях 31 пісьменніка. З найбольш вядомых і найбольш актыўных тут не прадстаўлены толькі сам аўтар. Разглядаюцца яны ў алфавітным парадку, а не ў залежнасці ад той ролі, якую адыгралі на ніве роднай літаратуры і культуры і таго аўтарытэту, які кожны з іх заваяваў. Тут ужо ніхто не можа лічыць сябе пакрыўджаным. Прытым аналіз творчасці робіцца па-чытацку зацікаўлена і панавуковаму ўзважана. Што ж датычыць кожнага канкрэтнага чытача, то ён ужо сам зверыць усе ацэнкі ўласнай падрыхтоўкай, ведамі, густамі, уяўленнямі, успрыманнем асаблівасцей і багацтваў мастацкага слова. Але незалежна ад чыйгосьці ўспрымання, індывідуальных схільнасцей да нейкага тыпу творчасці, на Беласточчыне ёсць свая творчая эліта, або, кажучы па-польску, „czołówka", бясспрэчна аўтарытэтная для кожнага непрадузятага чытача. Сюды перш за ўсё можна аднесці самога аўтара манаграфіі, які ў мастацкай творчасці выступае пад псеўданімам Алесь Барскі, а таксама такіх ветэранаў літаратурнага руху, як Віктар Швед, Сакрат Яновіч, Юрка Зубрыцкі (Георгій Валкавыцкі), Ян Чыквін, Васіль Петручук. Нельга сабе ўявіць літаратурнага і культурнага жыцця Беласточчыны без Міколы Гайдука, Міры Лукшы, Віктара Рудчыка, Дзмітрыя Шатыловіча. Наогул тут трэба было б пералічыць усіх пісьменнікаў, усе 31 прозвішча, дадаўшы яшчэ Янку Жамойціна, які сюды не трапіў.

Кожны аўтар непаўторна ўзбагачае агульную скарбніцу. Тут хочацца спаслацца на прыклад Міколы Гайдука, на яго кнігу „Паратунак", апублікаваную ў Мінску ў 1993 годзе і прызначаную беларускім школьнікам. У даходлівай форме аўтар абмаляваў першыя стагоддзі існавання Вялікага княства Літоўскага, заканчваючы сваё падарожжа ў гісторыю Грунвальдскай бітвай 1410 г. У сваёй кнізе ён не абмінуў, у прыватнасці, бітву на Ірпені (1332 г.), у выніку якой Гедымін разбіў аб'яднаныя сілы паўднёварускіх князёў і затым пасля месячнай аблогі ўзяў Кіеў. Пра тую бітву не ведаюць аўтары нашых афіцыйных гісторый (у тым ліку акадэмічных і энцыклапедычных выданняў) і падручнікаў для вышэйшых навучальных устаноў і сярэдніх школ.

Літаратура Беласточчыны не ўяўляе сабою чагосьці аднароднага. І гэтую яе асаблівасць выразна падкрэсліў Аляксандр Баршчэўскі, супрацьпаставіўшы творчыя пазіцыі Віктара Шведа і Надзеі Артымовіч, якая на беларускай глебе актыўна наследуе творчыя прынцыпы і мастацкія прыёмы польскіх мадэрністаў навейшага пакалення. Што ж датычыць Віктара Шведа, то вернасць нацыянальным традыцыям у яго творчасці ўспрымаецца не толькі як нейкая прыватная з'ява, але і як асаблівая заслуга паэта, якая забяспечвае яму ганаровае месца ва ўсёй літаратуры Беласточчыны, ва ўсіх яе здзяйсненнях. Яго творчасць з пачатку і да канца пацвярджае вывад аўтара манаграфіі: „В. Швед з'яўляецца паслядоўным прыхільнікам правільнага верша з захаваннем такіх яго атрыбутаў, як правільны радок, прысутнасць рыфмы і рытму, відавочнасць выразнага сэнсу ды чытэльнасць паэтычнага тэксту. Гэткага тыпу вершы ў творчасці В. Шведа выразна набліжаюцца да тае паэтычнае спадчыны, якую пакінулі такія паэты, як Я. Купала і Я. Колас" (с. 365).

Гэтыя вывады ўдакладняюцца і пашыраюцца далей: „Бадай што найбольш характэрнай рысай усяе творчасці В. Шведа з'яўляецца яе грамадзянскасць, і ў гэтым аспекце В. Швед свядома ідзе па тым шляху, па якім ішлі ў расійскай літаратуры М. Някрасаў і А. Кальцоў, а ў польскай — У. Сыракомля і М. Канапніцкая. В. Швед лічыць, што грамадзянскія пачуцці ў паэзіі не вычарпалі свае магчымасці ды свае пазітыўныя функцыі і што яны павінны выкарыстоўвацца на сённяшнім этапе развіцця беларускай літаратуры".

(працяг будзе)

Уладзімір Казбярук

Польска-беларускі жывапісны пленэр

На I польска-беларускі жывапісны пленэр „Белавежская пушча — геній прыроды — талент чалавека на сутыкненні культур", які з 20 па 29 верасня праводзіўся ў Дубічых-Царкоўных і наваколлі, прыехалі мастакі з Беларусі, Варшавы, Шлёнска і Гайнаўшчыны. Патранат над мерапрыемствам трымалі старшыня ПСЛ Яраслаў Каліноўскі і ўлады Еўрарэгіёна „Нёман".

Удзельнікі мерапрыемства наведалі Белавежу і Грабарку, ездзілі на экскурсіі ў Белавежскую пушчу. Іхнія працы паказваліся на выстаўцы ў мясцовым асяродку культуры. Адкрылі яе 27 верасня войт Дубіцкай гміны Анатоль Паўлоўскі, староста Гайнаўскага павета Уладзімір Пятрочук і камісар выстаўкі, мастак Адам Баяра з Варшавы. Падвялі яны вынікі працы ўдзельнікаў пленэру і ўручылі ім дыпломы. Перад удзельнікамі вернісажу з песнямі выступілі вучні Комплексу школ з Дубіч-Царкоўных. Мерапрыемства арганізавалася дзякуючы фінансавай падтрымцы Еўрарэгіёна „Нёман", Гайнаўскага старостава і актыўнасці працаўнікоў Дубіцкай гміны. Плануецца наладзіць пленэр у наступным годзе. Мастакі з Гайнаўшчыны і прыгранічных раёнаў Беларусі хочуць арганізаваць у сябе мастацкія цэнтры.

— З Камянца, Свіслачы, Гродна і Мінска прыехалі да нас прадстаўнікі маладога і старэйшага пакаленняў. Старэйшыя ўдзельнікі запрэзентавалі моцную рэалістычную школу. Малодшыя мастакі адкінулі навалачку ідэалогіі і зрабілі яшчэ лепшыя працы. Беларускія студэнты адважней клалі фарбы, з больш чыстымі і свежымі колерамі, — заявіў гайнаўскі мастак Віктар Кабац.

Беларускія госці найчасцей малявалі наваколле Дубіч. Іх пастэльныя і алейныя работы спадабаліся ўдзельнікам вернісажу, бо дакладна адлюстроўвалі краявіды і архітэктуру Дубіцкай гміны.

— Падабаюцца мне карціны польскіх мастакоў, іх манера; паказваюць яны ўнутраны, духовы свет прасякнуты экспрэсіяй. Я выканала рэалістычныя работы і хачу спецыялізавацца ў гэтым напрамку, — сказала Лена Крэчка, студэнтка Мінскага мастацкага вучылішча імя А. К. Глебава.

— Паколькі я жыву ў Свіслачы, прэзентую памежнае мастацтва. Мы рознімся ад польскіх сяброў мастацкімі школамі. У нас больш рэалізму, а ў польскіх калегаў — экспрэсіі, — заявіў Яўген Мацяшук са Свіслачы, які штодзень працуе столярам, а ў вольны ад працы час займаецца мастацтвам.

Варшаўскім мастакам вельмі спадабалася Белавежская пушча і яны выязджалі ў глыб лесу маляваць рэдка сустраканыя краявіды. З Гайнаўшчыны прыехалі Пётр Гаган, Віктар Кабац, Збігнеў Будзынскі, Дыяна Янчук, Тамара Кердалевіч і Барбара Грабяк. Гайнаўскія мастакі найчасцей малявалі краявіды.

Кожны ўдзельнік пленэру пакінуў па тры работы, якія будуць прэзентавацца на пастаяннай экспазіцыі. Будзе яна працаваць у старым школьным будынку. 29 верасня ў Гмінным асяродку культуры дубіцкія школьнікі вучыліся маляваць пад наглядам прафесійных жывапісцаў з Варшавы. Вучні знаёміліся з новымі тэхнікамі і варштатам працы прафесіяналаў.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Удзельнікі польска-беларускага пленэру

Зорка

старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Наперадзе „Калінка", за моладдзю — „Каліна"

Леанід Пранчак

Словы родныя

П'ём гарачую гарбату
З мёдам майскім упрыкуску.
І мяне бабуля вучыць
Гаварыць па-беларуску.

Васількі ў світальным жыце.
Вербы ніцыя над Сожам.
Беларусь: Бярэсце, Свіцязь,
Налібокі і Каложа, —
За бабуляй паўтараю.
Што ні слова,
Быццам песня.
Белавежа, Навагрудак.
Нарач, Вязынка, Палессе.

Словы родныя люблю я.
Вершаў ведаю багата.
Гукі мовы беларускай
Пахнуць верасам і мятай.

Ларыса Геніюш

Капуста

На гародзе стала пуста
Толькі пышная капуста
Ветру, сцюжы не баіцца:
Мае цёплыя спадніцы.
Гожая, здаровая,
Уся белагаловая.

Уладзімір Мацвеенка

Перакруткі

Саву́
Спалохаў
Са́ва,
Сава́
Спалохала
Са́ву.

Каб выступаць — трэба ведаць мову!

Знаёмства са школай у Залуках (Гарадоцкая гміна) пачынаем ад школьнай хронікі. Першае месца тут належыць калектыву „Калінка". У вочы кідаюцца густоўныя, белчырвоныя касцюмы з далікатнай вышыўкай і аздобамі.

— Пашыла іх пані Валянціна Паплаўская, — кажуць настаўніцы, — а вышыўкай заняліся дзяўчаты і іх мамы.

„Калінка" існуе два гады, але здолела ўжо дабіцца поспехаў. Выступала на беларускіх і польскіх мерапрыемствах, на вясковых дажынках, школьных святах. Музычным інструктарам гурту з'яўляецца Віктар Леанкевіч з Беластока.

— „Калінка" гэта дзіця „Каліны" (беларускі калектыў з Залук), — адзначаюць Яўгенія Грушэўская і Ева Паплаўская. Раней дарослыя спявалі з дзяцьмі, разам з імі ездзілі на агляды. Тады і падумалі, каб моладзі арганізаваць асобны калектыў. Настаўніцы можна назваць „мамамі гурту". Разам з дзяўчатамі прыязджаюць на конкурсы і фэсты. У мінулым годзе выступілі на тэатральным аглядзе ў Гайнаўцы і атрымалі вылучэнне.

Варта адзначыць, што ў Залуках доўгі час не было беларускай мовы ў школе. І вось, з пачаткам новага навучальнага года ў школе аднавілася навучанне роднай мове. На заняткі, якія вядзе Яўгенія Грушэўская, запісалася палова навучэнцаў.

— Бо каб добра спяваць і выступаць, трэба ведаць мову, — кажуць у Залуках. Школа ў Залуках невялікая — паўсотні вучняў. Згодна духу часу, у школе цікавяцца інфарматыкай. Праца з камп'ютэрам пачынаецца ўжо ў першым класе. У Залуках вывучаюць таксама спадчыну найбліжэйшага наваколля. У школе этнаграфічна-краязнаўчы музейчык і дзейны гурток скаўтаў-гарцэраў. Моладзі ладзяць адукацыйныя вандроўкі па наваколлі...

А наваколле тут не абы-якое — за вёскай Кнышынская пушча, непадалёк выцякае рака Супрасль.

Зорка

PS. Рэпартаж пра жыццё школы ў чарговым нумары „Нівы".

Міжнародны дзіцячы літаратурна-мастацкі конкурс

„Я — беларус, і тым ганаруся!"

Міжнароднае грамадскае аб'яднанне „Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»" абвяшчае конкурс сярод дзяцей беларускай дыяспары ўзростам 12-14 год. Конкурс будзе адбывацца па дзвюх намінацыях: мастацкія працы (малюнкі) і літаратурныя творы.

Тэматыка твораў:

— што значыць для мяне быць беларусам;

— асабістае ўяўленне і ўспрыманне роднай культуры;

— вытокі любові да Радзімы.

Усе працы павінны мець прозвішча і імя ўладальніка, узрост, зваротны адрас, па магчымасці, кантактныя тэлефоны.

Прымаюцца малюнкі (вертыкальныя ці гарызантальныя памерам А-3 (297 х 420 мм) і А-2 (420 х 594 мм), а таксама літаратурныя творы (верш, паэма, апавяданне, сачыненне і інш.). **Працы на конкурс прымаюцца да 15 лістапада**.

Адрас для дасылкі:
МГА „ЗБС «Бацькаўшчына»"
вул. Рэвалюцыйная, 15
Мінск, 220030

Пераможцы конкурсу атрымаюць каштоўныя падарункі.

Кантактны тэлефон у Мінску: (00375 17) 289 31 94.

Як гаспадар дзень расцягваў

(Латышская народная казка)

Адзін гаспадар зусім замардаваў сваіх парабкаў. Яны і так працавалі з раніцы да позняй ночы — ад цямна да цямна, а яму здавалася і гэтага мала — усё бурчаў ён, што дзень вельмі кароткі, а плата парабкам вельмі высокая. Хутар вялікі, зямлі ў гаспадара сто пурвіет — здаецца, што яшчэ трэба чалавеку! — дык не, адолела яго прагнасць. Ходзіць ды бурчыць, ходзіць ды бурчыць.

Надакучыла бурчанне гаспадара аднаму парабку, вось ён і сказаў яму, што дзень можна расцягнуць. Трэба, кажа ён, насадзіць сонца на вілы ды і трымаць колькі хочаш, каб яно не рухалася па небе!

Узрадаваўся гаспадар. Пабег да каваля, заказаў вялікія вілы. Насадзіў вілы на доўгую жэрдку. Прымерваецца да сонейка, з якога боку насадзіць яго ямчэй, а парабкам кажа:

— Цяпер працаваць вы будзеце да таго часу, пакуль я буду трымаць віламі сонца! Каму не падабаецца — можаце ісці на ўсе чатыры бакі! — і ўзлез на ўзгорак.

У поўдзень падняў ён вілы да сонца і пачаў трымаць...

Мінае гадзіна, мінае другая.

Стаяў, стаяў гаспадар — потам аблiваецца, рукі-ногі дрыжаць, паясніцу ломіць, сілы больш няма. Вываліліся ў яго вілы з рук, а ён і нагнуцца не можа...

Парабкі бачаць — гаспадар ужо не трымае сонца, таксама працу кінулі. Угавор — дык угавор!

Гаспадар да сонца глядзіць, ледзь ад злосці не лопаецца — сонца яшчэ высока, а парабкі дадому павалакліся.

Скарынка

Упала скарынка хлеба пад стол. Цвердаватая, абкусаная, з цёмнага хлеба. Папраўдзе, сама не ўпала, а кінуў яе Паўлік. З'еў тое, што яму смакавала. І не скінуў яе спецыяльна, а проста так, ссунулася з абруса. А там, упала дык упала. Бабуля не бачыла, дык нічога... Бабуля казала: упадзе хлеб, дык падымі, пацалуй, прасі ў яго прабачэння, што не ўшанаваў. Хлеб — святая рэч. Без хлеба няма жыцця. Колькі зярнятак у адным каласку, колькі калосся на полі! Колькі поту калісь вылівалі людзі, каб сабраць плён! Змалаціць, змалоць. Спячы. Цяпер і на вёсках хлеб купляюць. Скарынка была ад „віленскага" хлеба, цёмнага, на квасе, з дадаткам кмену. Нават на скарынцы тое зерне кмену пабліскавала, прыпечанае. Час часом Паўлік любіў пагрызці скарыначку, пажаваць зерне. А сёння тая скарыначка ўпала... Ну, дык хай і ляжыць на падлозе...

Схапіў скарынку Бобік і панёс на падворак. Ды галодны не быў — якраз быў паснедаў. Дарэчы, больш даспадобы старому сабаку белы хлеб, мяккі, не кіславаты. Кінуў Бобік скарынку каля карытца з вадой, з якога пілі куры ды гусі. Звочыў певень Пеця хлеб, стаў склікаць сваіх жанок на частунак. Збегліся куры з куранятамі, накінуліся на скарынку. Вядома, у гэтым толку ніякага не было — хутчэй пасварыліся, чым наеліся. Ажно пёры паляцелі, нарабілі такога гвалту, ледзь Пеця супакоіў сваю грамадку. На крышыны зляцеліся вераб'і і дзікі сівы голуб. Зараз жа і варона раскрычалася: „Кар-кар-р-р!" — ухапіла большы кавалак у дзюбу ды з лопатам панеслася за плот, на поле, каб спакойна скаштаваць здабычу. Відаць, не вельмі смачна ёй елася, ці спалохалася трактара, які з грукатам, уздымаючы пыл, праехаў па дарозе. Кінула варона хлеб.

Засталася скарынка на полі. Не зернем ужо была, не коласам, і нават не хлебам. Пад халодным асеннім дажджом злілася з глебай.

Міра Лукша

Паплёўся і ён да сябе.

А гаспадыня — свайму мужу пара! — суцяшае яго.

— Ты, мужанёк, заўтра прытрымай сонейка бліжэй да вечара, яно тады стаіць ніжэй — трымаць будзе лягчэй.

Добра. Назаўтра гаспадар да вечара ў пасцелі праляжаў, ледзьве ўстаў. І зноў на той жа ўзгорак, з віламі. Праўду жонка казала — сонца стаіць нізка. Падняў гаспадар вілы, думае: „Я іх прымушу папрацаваць, парабкаў-лайдакоў!"

Толькі ў гэты раз здалося яму яшчэ цяжэй. З гадзіну патрымаў вілы ў руках, замітусілася ў яго ў вачах, пайшлі чырвоныя кругі — і паваліўся гаспадар на зямлю, як сноп. Ледзь-ледзь гаспадыня прымусіла яго ўстаць.

— Ты, мужанёк, заўтра перад самым захадам вазьміся!

Паглядзеў на яе гаспадар, нічога не сказаў. Больш ён дня не расцягваў.

Міхась Пазнякоў

Запрашаю

Я на дачы працаваў:
І палоў, і паліваў.
А сягоння запрашаю
Вас на свята
Ураджаю.

Гэткай вырасла цыбуля —
Пазайздросціла бабуля.
І гарох, і боб —
На дзіва!
Рэпа слаўная ўрадзіла.

А якія агуркі!
Я не еў яшчэ такіх.
Морква —
Растае ў роце.
Пачастую ўсіх —
Прыходзьце!

Наталька

Усе беларускія мерапрыемствы маюць адну файную прыкмету: тут сустракаюцца „старыя" сябры — часам пасля доўгага перапынку.

Наталька Хомік з Беластока на „Родным слове" сустрэла сяброў з... прадшколля. Дзяўчынка раней хадзіла ў беларускі садок. Наталля — вучаніца ПШ н-р 12. Хаця ў яе школе не вывучаюць беларускай мовы, дзяўчынка не парвала кантакт з родным. Яна кожны тыдзень хадзіла ў ПШ н-р 11, дзе пад кірункам настаўніц Тамары Бялькевіч і Надзеі Хмялеўскай дасканаліла мову продкаў.

Выступленне пяцікласніцы публіка ўзнагародзіла бурнымі воплескамі, а ў час перапынку дзяўчынкі ўспаміналі садок і расказвалі пра свае справы.

Зорка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Усярэдзіне хаткі канца XIX стагоддзя

Афрыканскія страусы ў Новым Беразове

12 верасня 2003 г. III „а" клас Гімназіі з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы наведаў Новае Беразова. На экскурсію мы паехалі на веласіпедах разам з нашымі настаўнікамі Славамірам Чыквіным і Іалантай Грыгарук.

У вёсцы затрымаліся перад старою хатай, у якой жыве сімпатычная бабуля, якая пачаставала нас смачнымі яблыкамі. Пасля пачастунку мая сяброўка — Марта, завяла цэлы клас у скансэн свайго бацькі. У яго вельмі цікавы занятак. Спадар Сцяпан Чабай гадуе страусаў.

На вялікім панадворку стаяць дзве хаты. Старыя дамы напамінаюць нам пра жыццё сялян канца XIX стагоддзя. Адзін з іх пакрыты страхою і абгароджаны плотам з тонкага галля. У другім будынку рамантуюць памяшканні, у якіх будуць жыць турысты. Гэтай хаце таксама будзе вернуты даўні выгляд.

Пасля мы пайшлі паглядзець страусаў. Гэта вельмі вялікія птахі, маюць доўгую шыю і даўжэзныя, моцныя ногі. Страусы прыязныя для людзей. Мой сябра пачаў „разварушваць" адну з птушак — скакаў высока і махаў рукамі, а страус памагаў яму і крычаў на сваёй птушынай мове. Давялося нам пабачыць як птушкі танцуюць. Выглядала гэта сапраўды дзіўна. Некалькі сяброў асмелілася пакарміць страуса травою з рукі. Я не хацела рызыкаваць!

Пасля мы расклалі вогнішча, пяклі ды елі каўбасу. На канец зрабілі супольную фатаграфію, падзякавалі гаспадару за гасціну і вярнуліся ў Гайнаўку.

Гэты выезд многаму мяне навучыў. Я змагла ўявіць даўняе жыццё людзей, а таксама пабачыла жывых афрыканскіх страусаў. Шчыра заахвочваю наведваць гэтае месца, а спадару Сцяпану Чабаю жадаю поспехаў у працы, а ў галоўным — у стварэнні скансэну.

Марта Кузьма,
III „а" клас белгімназіі ў Гайнаўцы

Польска-беларуская крыжаванка № 41

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 37: Мак, нага, жораў, калодзеж, надзел, нырка, шыя, ар. Кажан, кола, родны, надзея, маўзер, елка, шарж, жар.

Узнагароды — жэлевыя трохколерныя аўтаручкі — выйгралі: **Наталля Сцепанюк** з Беластока і **Пятрусь Герасімюк** з Арэшкава. Віншуем!



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Белая вежа

Белая вежа або Камянецкі стоўп

— А ў нас рамонт! — рабочы з пнеўматычным молатам заступіў нам дарогу.

— Не жартуйце! — уміг мы страцілі рашучасць і з недаверам зірнулі ўверх. На ўсіх паверхах Белай вежы вуркацелі адбойныя малаткі, ляскалі дошкі, пераклікаліся рабочыя.

— Спецыяльна з Польшчы прыехалі, — пачалі мы. — Спецыяльна, для вашай вежы.

Беларусы спагадныя людзі, асабліва дзядзькі з рамонтнай брыгады. Наш рабочы адклаў малаток, паглядзеў на нас літасціва і з пэўным захапленнем.

— Пачакайце тут, — бліснуў залатой усмешкай, — *шчас* спрашу брыгадзіра.

Праз момант мы ўздымаліся на верх Белай вежы. Першыя два паверхі мы адолелі па драўляных драбінах, зробленых на час рамонту. Далей лезлі драўлянымі ўсходамі з разнымі парэнчамі. Пяты паверх, які вядзе на галерэю вежы, у клімаце старажытных замкаў. Апошні адрэзак забірае найбольш энергіі, высокія мураваныя прыступкі (як у Мірскім замку) адымаюць апошнія сілы. Пасля ўжо толькі стаіш і глядзіш, аддыхваешся, захапляешся.

На карце шукаем мясціны па простай лініі ад Камянца на Беласточчыну. Замест, як унушае назоў нашай Белавежы — бачым Грабарку!

* * *

У сапраўднасці вежа — з чыронай цэглы, а сам Камянец сорак кіламетраў ад Белавежскай пушчы. Будынак вядомы таксама як *Камянецкая вежа* або *Камянецкі стоўп*. Яшчэ дзесяць гадоў назад вежа была размаляваная на белы колер. Супраць варварскай трактоўкі гістарычнага помніка пратэставалі мастакі і гісторыкі, і, дзякуючы ім, будынку вярнулі першапачатковы выгляд.

Камянецкая вежа пабудаваная паміж 1276-1288 гадамі дойлідам Алексам, паводле загаду валынскага князя Уладзіміра Васількавіча, як памежны апорны пункт. На працягу стагоддзяў чатыры разы разбураная і спаленая. Будынак грунтоўна рэканструяваны ў 1903 годзе.

Вежа мае каля 30 метраў вышыні, вонкавы дыяметр 13,5 метра, таўшчыня сцен 2,5 метра. У сярэдзіне падзяляецца драўлянымі памостамі на пяць паверхаў. У сценах знаходзяцца нішы і стралковыя байніцы. Вежа перакрытая нервюрным скляпеннем з кранштэйнамі, над якімі ўзвышаецца баявая галерэя, пазначана 14 зубцамі.

З высі прасторны далягляд на даліну ракі Лясной і Белавежскую пушчу. Прывабна выглядае і сам Камянец, адной з прыгажэйшых тут карцін Сімяонаўская царква ў рэспектыўна-рускім стылі.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Далягляд з вежы

У сярэдзіне вежы размяшчаецца краязнаўчы музей. На жаль, з-за рамонту мы не змаглі яго аглянуць.

* * *

У Камянцы мы сустрэлі турыстаў, і гэта не былі арганізаваныя экскурсіі з калгасаў і прадпрыемстваў, толькі маладыя сужонствы і парачкі, якія прыехалі на ўласных машынах.

Горш з турыстычнымі паслугамі, у мястэчку нельга купіць паштоўкі і даведнікі пра горад і наваколле. Замест славутай настойкі „Белавежскі бальзам" у магазіне нам прапанавалі гарэлку брэсцкага разліву „Беларусь сінявокая". Самы нясмачны выпадак сустрэў нас у рэстаране „Юбілейная". Рэстаран пабудаваны ў цэнтры, непадалёк вежы. У сярэдзіне ўжо праведзены „еўрарамонт", на практыцы гэта абазначае замену ранейшага інтэр'ера прывезенымі з Беластока аддзелачнымі матэрыяламі як керамічная плітка, тэракота, шкляныя і пластмасавыя ўпрыгожанні.

Нягледзячы на рух у мястэчку, у рэстаране не было жывой душы. Каб пасмакаваць рэгіён, мы заказалі катлету „Белавежская пушча" і салаты. Каб адзначыць дзень нараджэння сяброўкі Дыяны, мы заказалі шампанскае. Другі заказ атрымаўся без закіду, дзеля юбілейнага напітку мы атрымалі спецыяльныя кілішкі. Затое катлетка з паэтычнай мянушкай да вечара стаяла нам у горле. Не цяжка здагадацца, што пачаставалі тут тухлым мясам. Каб не пакрыўдзіць гаспадароў, мы міжвольна глыталі „белавежскую пушчу" і ўяўлялі старадаўнія гасціны, на якіх, у якасці смакоцця, падавалі дзічыну, якая, згодна рэцэпту, павінна набраць паху, пакуль трапіць на стол.

* * *

Белая вежа вытрымоўвае параўнанне паміж уяўленнем і рэчаіснасцю. Як сімвал абароны ды моцы натхняла паэтаў і жывапісцаў. Нас сустрэлі таксама незвычайныя эмоцыі, дарога па драбінах, у якіх дзе-нідзе не хапала прыступак, удала заступіла модны экстрэмальны спорт. Калі мы зыходзілі з галерэі, нам асіставаў згаданы ўжо рабочы. Дзядзька, як рыцар, стаяў з элегантна працягнутай рукой і з прамяністай усмешкай дапамагаў выбрацца з цёмнага лабірынту.

Зразумела, такі гонар сустрэў толькі абраных дзяўчат-журналістак, якія рашыліся ўвайсці на легендарную вежу. Нашы хлопцы, стомленыя спёкай і сонасцю мястэчка, як заварожаныя, шлындаліся вакол стаўпа.

Ганна Кандрацюк

Беларусы на Гданьскім узбярэжжы

Лена Глагоўская, дачка Віталя Казлоўскага і Сафіі з Томчыкаў, родам з Ярылаўкі на Беласточчыне, доктар гуманітарных навук у Беластоку і Гданьску. І ўсюды, куды трапіць з нагоды сваіх пошукаў няўрымслівая даследчыца, адчувае сябе ў сябе — на тэрыторыі, у часе. Ходзіць слядамі тых, каго ўжо няма ў жыцці, і вяртае іх жыццю. Узброеная ў навукова-даследчыцкія прылады, навукова разбірае жыццяпісы, а таксама на старонках „Czasopisu" ды „Нівы" і іншых часопісаў (больш за 100 артыкулаў змешчаных у польскім і замежным друку) з журналісцкай іскрай набліжае чытачам людзей „як жывых". Лена Глагоўская — выпускніца Факультэта журналістыкі і палітычных навук Варшаўскага універсітэта. Ад 1984 г. выкладае ў Гданьскім, а ад 1998 г. — у Беластоцкім універсітэтах. У полі зацікаўлення Лены Глагоўскай — нацыянальна-этнічныя праблемы, а ў прыватнасці палітычная і грамадская гісторыя беларусаў. У 1996 г. апублікавала кнігу пз. *Białoruś 1914-1929. Kultura pod presją polityki*. Актыўна ўдзельнічае ў грамадска-культурным жыцці, м.інш. з'яўляецца членам рэдакцыйнага калектыву штомесячніка „Czasopis", ад 1993 г. — старшынюе Беларускаму культурнаму таварыству „Хатка" ў Гданьску. Удзельнічаючы ў беларускім грамадска-культурным жыцці на Гданьскім узбярэжжы, занялася таксама яго навуковым вывучэннем, і вынік даследаў — кніга *Białorusini na Wybrzeżu Gdańskim*, выдадзеная ў Торуні Выдавецтвам Адам Маршалак. Прысвяціла багата фактаграфічную кнігу *Усім беларусам, якія рознымі звеннямі жыцця і дзейнасці звязаны з Гданьскім узбярэжжам*.

Гданьск і Узбярэжжа займаюць асаблівае месца ў развіцці арганізацыйных форм беларускага жыцця, зазначае ва ўступе даследчыца. Ад 1967 г. існуе тут арганізаваны беларускі рух. Не ўдалося спрабаваць сарганізаваць беларусаў у Шчэціне, Кашаліне, Лодзі і Вроцлаве. (Па-за Беласточчынай, дзе беларусы пражываюць на сваіх этнічных землях, вельмі дзейны быў рух ад 1956 г. у Варшаве). У кнізе прадстаўлена прысутнасць беларусаў на Гданьскім узбярэжжы ад міжваеннага перыяду. Пасля вайны Узбярэжжа было адным з месц, дзе ахвотна пасяляліся беларусы з Беласточчыны з адукацыйнымі мэтамі і шукаючы працы, шмат знайшло тут прыстань у выніку вайны і рэпатрыяцыі з СССР. У 1967 г. узнік тут аддзел БГКТ. На пачатку 90-х гадоў, калі дазволена было ствараць новыя меншасныя арганізацыі, паўстала „Хатка". У працы прадстаўлена культурная ды аматарская дзейнасць, навучанне беларускай мовы, даклады, кантакты з Беларуссю, змешчаны біяграфіі Мікалая Дварэцкага, Андрэя Вангіна і Лукаша Дзекуць-Малея. У анэксе — хроніка беларускай дзейнасці на Узбярэжжы, састаўлены спісак (паводле членскіх дэкларацый) асоб, якія былі звязаны з г.зв. „Беларускім клубам" у Гданьску.

Збіраючы матэрыялы, аўтарка скарыстала метад апытальнікаў, інтэрв'ю і шматгадовага „ўдзельнічаючага назірання" (ад 1987 яна ўдзельнік і арганізатар культурна-асветнага жыцця на Узбярэжжы). Скарыстала даступныя архіваліі, матэрыялы розных арганізацый, прыватных асоб, сярод гэтага — фатаграфічныя калекцыі. З прычыны таго, што праца накіравана да польскага чытача, большасць цытатаў перакладзена на польскую мову.

(лук)

*Helena Głogowska, *Białorusini na Wybrzeżu Gdańskim*, Toruń 2003, ss. 262.

У храм за білетамі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Васкрэсенская царква „Спас на крові"

У Аляксандра-Неўскую Свята-Троіцкую лаўру заязджалі мы двойчы. Першы раз прыбылі перад закрыццём Свята-Троіцкага сабора. Тады дазволілі нам зайсці ў храм і прылажыцца да мошчаў св. князя Аляксандра Неўскага. На наступны дзень прысутнічалі мы на галоўным богаслужэнні. Людзей у храме было мала. Студэнты Духоўнай акадэміі і семінарысты, якія засталіся на час канікулаў у Пецярбургу, маліліся з самой раніцы. Пазней на малітву збіраліся пецярбуржцы і паломнікі.

У 1712 годзе на месцы перамогі князя Аляксандра Неўскага над шведамі заснавана была драўляная царква. Пазней распачалася будова мураванага корпуса і царквы. У 1724 годзе імператарам Пятром I у лаўру былі перанесены мошчы св. Аляксандра Неўскага. Перад рэвалюцыяй манастыр лічыўся даволі багатым. Яго капітал састаўляў 3 мільёны рублёў. На тэрыторыі лаўры жыло 150 манахаў і паслушнікаў. У манастыры было 11 цэркваў. Частка іх стаяла на прыманастырскіх Лазаравых могілках, дзе пахаваны вядомыя пісьменнікі і дзеячы культуры. Пакояцца тут Фёдар Дастаеўскі, Пётр Чайкоўскі ці Міхаіл Ламаносаў. Будова велізарнага Свята-Троіцкага сабора распачалася ў 1719 годзе. Знаходзілася ў ім многа вялікіх ікон і залатых упрыгожанняў. Пасля рэвалюцыі сабор перайшоў да абнаўленцаў (з 1923 па 1926 год), якія падтрымалі савецкую ўладу, а на плошчы перад саборам пачалі хаваць „выдатных" бальшавікоў. У 1933 годзе свецкія ўлады закрылі сабор і перадалі яго на Дом навукі. Толькі праз 20 гадоў сабор вярнулі праваслаўным і пасля двухгадовага рамонту распачаліся ў ім богаслужэнні. У 1989 годзе ў царкву вярнулі мошчы св. Аляксандра Неўскага, якія ад 1922 года знаходзіліся ў Музеі гісторыі рэлігіі і атэізму. Манастырскі комплекс складалі шматлікія цэрквы, якія ў дваццатыя і трыццатыя гады забралі праваслаўным. Многіх не вярнулі да гэтага часу, а на Лаўрскія могілкі яшчэ і зараз можна ўвайсці толькі за музейным білетам.

Пасля Літургіі ў сабор заходзілі вернікі і турысты. Многія прыкладаліся да мошчаў і ікон. Звонку сабор і манастырскія будынкі часткова адрамантаваны. Відаць, што Неўская лаўра намнога бяднейшая за Сергіеву лаўру. Можа таму, што распаложана яна ўсярэдзіне горада і паломнікам, якія пакідаюць ахвяраванні, цяжэй дабрацца да лаўры.

Вялікае ўражанне зрабіла на нас Васкрэсенская царква, якую называюць „Спас на крові". Ужо здалёк відаць яе каляровыя мазаікі і таму хацелася зайсці ўсярэдзіну. На месцы аказалася, што храма не вярнулі праваслаўным вернікам. Надалей працуе ён як музей. Жыхары Расійскай Федэрацыі маглі ўвайсці ўсярэдзіну за 50 рублёў (каля 2 долараў). Замежным наведвальнікам (нават з Беларусі і Украіны) за ўваход трэба было заплаціць па 250 рублёў (каля 10 долараў). Хаця царква звонку вельмі прыгожая, усярэдзіне — пустая, без прастола, аналояў, харугваў і царкоўнага начыння. Гіды асаблівую ўвагу звярталі на каштоўныя мазаікі з выявамі біблейскіх сюжэтаў. Ззаду храма было пазначана месца, на якім Ігнат Грынявіцкі ў 1881 годзе забіў цара Аляксандра II. Стаіць там крыж з мармуру і граніту, перад якім у мінулым гарэла лампада. Каля мазаічных ікон змешчана пакаянная малітва св. Васілія Вялікага, якая ўзмацняе пакаянны характар царквы. Спачатку на месцы смяротнага ранення цара збудавана была капліца і толькі ў 1888 годзе распачалася будова храма. Мазаіка, якая захапляе турыстаў, выконвалася ў майстэрні Фраловых і лічыцца адной з лепшых у свеце. Царква была закрыта ў 1930 годзе і перад II сусветнай вайной разглядалася прапанова яе ліквідацыі. Хаця пасля сталі лічыць храм помнікам архітэктуры, адкрылі ў ім майстэрні і склады дэкарацый. У 1970 годзе „Спас на крові" быў перададзены музею „Ісаакаўскі сабор" і пачаліся ў ім рэстаўрацыйныя працы. Зарэгістраванае ў 1990 годзе праваслаўнае згуртаванне выступіла да ўлад з просьбай вярнуць ім царкву, але не дачакалася станоўчага рашэння. Можна сказаць, што Санкт-Пецярбург з'яўляецца выключэннем сярод вялікіх рускіх гарадоў, якія паспяхова вяртаюць храмы Рускай праваслаўнай царкве. Васкрэсенская царква і Ісаакаўскі сабор з'яўляюцца прыкладамі насмешкі сённяшніх улад над святынямі.

У цэнтры горада, побач цэркваў, раскінуліся прыгожыя магазіны з вопраткай і прамысловымі прадуктамі, рэстараны і кафэ. Складаней было знайсці магазіны з кніжкамі і прадуктамі харчавання. У многіх месцах турыстам прапанаваліся экскурсіі па каналах горада. Турыстычныя бюро заахвочвалі наведаць прыгарады.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Аляксандра-Неўская лаўра

Канцавізна

Побач шашы з Дакторцаў у Сураж насупраць вёскі Канцавізна стаяць два абгароджаныя крыжы. Крыж, які відаць з левага боку, лічыцца агульным крыжам усяе вёскі. На ім надпіс: „Спаси Гос. О здравіи Никифора, Івана, Матвея, Николая, Игнатія, Павла. Сей кр. сор. жит. Концовизны 1913 г. 29 іюня". Другі крыж, з металічным верхам, лічыцца сямейным крыжам роду Зінчукоў. На яго бетонным пастаменце выразаны надпіс: „Спаси Господи люди Твои. О здравіи Игнатія, Екатерины, Александра, Василія, Николая, Андрея и их семей. Сор. 1929 г. 19 мая".

Вёску Канцавізна ў мінулым заснавалі выхадцы з іншых падляшскіх вёсак — Зубава, Дзядковіч, Плюціч, — якія купілі землі ў месцы ранейшага маёнтка. У час рэлігійнай нецярпімасці праваслаўныя жыхары Канцавізны спазналі шмат гора з боку сваіх суседзяў, а апагеем разгулу шавінізму было спаленне вёскі бандай у дзень каталіцкіх Грамніц, 2 лютага 1946 года.

Нягледзячы на небяспечныя абставіны жыхары Канцавізны не пакінулі сваёй вёскі, але адбудавалі яе. Сёння пражывае там каля 35 душ. Найстарэйшаму жыхару будзе восемдзесят гадоў, а наймалодшая асоба вучыцца ў трэцім класе гімназіі. Адна асоба вучыцца ў матуральным класе ліцэя і некалькі штудзіруе.

Як паінфармавала мяне солтыс Канцавізны Анна Крукоўская, гаспадаранне ў яе вёсцы засяроджваецца галоўным чынам на вытворчасці малака. Ёсць тры вялікія гаспадаркі, у якіх гадуецца 15, 30 і 40 малочных кароў плюс маладняк; ёсць і тры гаспадаркі меншыя. Ад шасці гадоў у Канцавізне гаспадары сталі браць халадзільныя рэзервуары для малака. Цяпер такіх прылад у вёсцы шэсць; хто здае малако, без іх не абыдзецца, бо малаказавод у Лапах аб'явіў, што з бітонаў малака прымаць не будзе. Цяпер цыстэрна з Лап забірае ад гаспадароў малако кожны другі дзень.

Умовы для малочнай прадукцыі ў Канцавізне добрыя. Добрыя тут землі з аднаго боку, а з другога рака Нарва і сенажаці. Не ўсюды ёсць доступ да ракі, каб напаіць кароў, таму часам даводзіцца давозіць ваду каровам, што на пашы, у бочках. Ад шасці гадоў у Канцавізне працуе водаправод. Свае палі тамашнія сяляне абсяваюць галоўным чынам кукурузай, пшаніцай і пшанжытам. Раней садзілі буракі, але з-за засухі і вялікіх коштаў іх апырсквання кінулі гэты занятак.

Сама вёска невялікая, ад шашы да яе жвіраваная дарожка, насціл вясковай вуліцы брукаваны. Няма ў Канцавізне і шыкарных дамоў, людзі тут жывуць ціха і працавіта. Як і ў іншых вёсках, частка жыхароў шукае свайго месца ў жыцці ў шырокім свеце, але ёсць і такія, якія не цураюцца тае зямлі, на якую прыехалі іх прашчуры.

Аляксандр Вярбіцкі

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Аляксандр і Надзея Кабаці з Міхнаўкі

Нараўка

Паўвека разам

20 верасня ў Нараўцы дзевятнаццаць пар атрымалі медалі „За шматгадовае шлюбнае сужыццё", прысвоеныя прэзідэнтам РП. Старшыня Рады гміны Славамір Кулеша і войт Мікалай Павільч уручылі іх парам: Паўлу і Марыі Зубрыцкім з Баб'яй Гары, Уладзіміру і Анне Салавянюкам з Падляўкова, Яну і Любе Паўлючукам з Альхоўкі, Шыману і Веры Болтрыкам са Слабодкі, Рыгору і Людміле Савіцкім ды Яну і Яўгеніі Навіцкім са Свінарояў, Яну і Тацяне Карпюкам ды Мікалаю і Вользе Карпюкам з Капітаншчыны, Яну і Кацярыне Драздам ды Мікалаю і Зіне Драздам з Міклашэва, Міхалу і Зіне Болтрыкам ды Міхалу і Марыі Крышаням з Нараўкі, Уладзіміру і Зіне Панкоўскім са Стачка, Аляксандру і Надзеі Кабацям з Міхнаўкі, Канстанціну і Надзеі Каролькам са Старога Ляўкова, Сяргею і Марыі Каральчукам ды Фёдару і Вользе Харкевічам з Новай Лукі, Аляксандру і Веры Лясотам з Пасек ды Яну і Юльі Шыманюкам з Семяноўкі.

Прадстаўнікі гмінных улад ды кіраўнічка ЗАГСа Ніна Янцэвіч павіншавалі паважаных юбіляраў, зычылі ім здароўя і шчасця, а таксама ўручылі прыгожыя букеты кветак. Шчырыя і сардэчныя пажаданні атрымалі яны таксама ад сваіх дзяцей і ўнукаў. Сардэчная атмасфера і пяшчотныя словы падзякі за шматгадовую працу і выхаванне дзяцей некаторых юбіляраў расчулілі да слёз. Для іх усе прысутныя спявалі шумнае „Sto lat". І гэты спеў прагучаў лепш чымсьці папярэджваючы ўрачыстасць вясельны марш Мендэльсона, запіс якога даволі сцерты шматразовым прагонам.

Адна з „залатых" пар — Аляксандр і Надзея Кабаці з Міхнаўкі ўвесь час займаліся земляробствам. Абраблялі дзевяць гектараў. Спадарыня Надзя шэсць гадоў працавала на керамічнай фабрыцы ў суседнім Старым Ляўкове. Яна ўжо 26 гадоў спявае ў калектыве „Цаглінкі". Спадарства Кабаці маюць трое дарослых дзяцей: дзве дачкі — Марыю і Анну ды сына Віктара. Адна дачка жыве і працуе ў Беластоку, другая ў Гайнаўцы, а сын — у Беластоку (тут ён працуе на мэблевай фабрыцы).

Як пазнаёміліся Аляксандр і Надзея?

— На танцавальнай забаве ў Міхнаўцы, — кажа Надзея. — Тады танцы ладзілі па хатах. Я нарадзілася ў Навінах, тут пражывала з бацькамі. З Навін у Міхнаўку рукой падаць. Муж мой быў адзіным сынам у сваіх бацькоў.

Як удалося пражыць разам паўвека? Спадарыня Надзея сказала, што найважнейшая згода ў сям'і. Жывем мы згодна, дружна і... маем „залатое вяселле".

Янка Целушэцкі

Мікалай Лук'янюк

Шчырая падзяка

Шчыра дзякуй табе, дарагая,
За супольна пражытыя гады
Вельмі хутка той час пралятае.
Пяцьдзесят год мы ўжо пражылі.

Тры вуглы ты ў хаце трымала,
Даглядаючы дзетак сваіх,
На навуку ты іх пасылала,
Каб шчаслівыя ў свеце жылі.

Надалей ты ўсё даглядаеш,
За парадкам у сям'і ты сачыш.
Я ад шчырага сэрца жадаю:
Яшчэ дваццаць пяць год пражыві.

Пражыві ў здароўі і шчасці,
Не спазнай аніякіх турбот,
На душы і на сэрцы мей радасць, —
Каб у гэтым табе Бог дапамог.

Блізкае бежанства

Успаміны Міхала ТАРАСЕВІЧА, жыхара Гайнаўкі, народжанага 4 лютага 1939 года ў Пасеках.

Як мне расказала мама, калі насталі ў нас немцы, яны адразу — 22 верасня 1941 года — прыехалі ў нашу вёску. Усіх сагналі на адзін панадворак і загадалі мужчынам легчы тварамі ўніз, а жанчын з дзецьмі заперлі ў хату. Самыя яны шукалі ў Пасеках партызан і ўзбраення. Нічога яны не знайшлі і, вызваліўшы жанчын і мужчын, загадалі праз гадзіну забраць хто што можа і пакінуць вёску, якую яны рашылі спаліць. І калі людзі пакідалі той панадворак, двух немцаў стаяла ў варотах з дубінкамі і білі імі выходзячых.

Везлі нас пад канвоем, а куды — мы не ведалі. Ехала нас мо з дваццаць фурманак. Калі мы праязджалі каля Лукі, бацька прасіў немцаў, каб дазволілі астацца, але яны не згадзіліся і загналі нас у вёску Бахуры. Пасялілі нас там па чатыры сям'і ў адной хаце; мы жылі на павароце да капліцы — яшчэ тая хата там стаіць. Цяжка было ўсім, але гаспадар баяўся нас адправіць. Неўзабаве прыехалі зноў немцы і сказалі, што можна раз'язджацца да сваіх блізкіх.

Наша сям'я пераехала ў Семяноўку да татавага швагра. У іх не было дзяцей, а хата вялікая — у адной яе палове размяшчалася школа. Пасля дзядзька прыняў яшчэ аднаго знаёмага і нам стала цесна. Тады тата з дзядзькам з нейкага хлява паставілі на дзядзькавым панадворку хацінку, у якой мы жылі да вызвалення. Помню ўжо добра, як прыходзілі да нас партызаны і нечага шукалі. А мы баяліся, бо ў Семяноўцы жылі таксама немцы, якія ахоўвалі мост на Нарве, праз які пралягала чыгуначная лінія з Гайнаўкі ў Свіслач.

Калі немцы сталі адступаць перад надыходзячым фронтам, мы рашылі прыхавацца ў Белавежскую пушчу. Помню, як увечар паклалі мы на фурманку пасцель і іншыя рэчы ды выехалі. У той час па чыгунцы ішоў паравоз з адным вагонам і рваў мост. Быў вялікі гук, які яшчэ сёння стаіць у маіх вушах.

Сядзелі мы на ўскраіне пушчы тры дні. Аднойчы раніцай адна жанчына зарэзала курыцу і зварыла суп. Мы сядзелі кружком і елі той суп, калі ў міску трапіў асколак ад міны; на шчасце нікому з нас нічога не сталася. Мы ўцяклі далей у пушчу, на паляну ў Кузьмін лес і там прасядзелі чарговых некалькі дзён. Наведалі нас партызаны, прасілі есці, і сказалі нам ад'ехаць яшчэ глыбей, бо мела быць вялікая перастрэлка. Заехалі мы ў 15-ы квартал і сталі пад вялікімі дубамі. Ноччу пайшоў праліўны дождж і каб ад яго прыхавацца нашы парабілі буды з яловага лубу. З сабою мелі мы карову і каня.

Далёка было чуваць выстралы гармат. Каля нас салдаты пракладалі правады і сказалі нам, што можна будзе вяртацца дадому, калі яны тыя правады знімуць. Праз два дні мы выехалі з лесу; я ехаў разам з дзядзькам і цёткай. Нейкіх трыста метраў перад Семяноўкай на дарозе ляжала мёртвая жанчына. У дзядзькавай хаце ляжаў труп савецкага салдата, а на стале была разабрана вінтоўка; відаць чысціў ён ружжо, калі за хатай узарваўся снарад і асколак забіў яго. У нашай хаціне на падлозе ляжала салома, відаць спалі на ёй салдаты, а на дне ў сагане асталося крыху маннай кашы; я тады ўпершыню паспрабаваў яе.

Калі фронт аддаліўся мы рашылі вяртацца ў Пасекі. Усё трэба было будаваць ад пачатку; у 1945-46 гадах была г.зв. свабода і за карыстанне лесам ніхто не караў. Я пайшоў у Семяноўку ў школу; хадзілі туды і малыя, і вялікія — было весела. Пасля заканчэння школы ў Семяноўцы я далей не вучыўся, бо не было на тое сродкаў ды і школ тады было мала.

29 жніўня 1959 года Пасекі наведала вялікае гора — дзеці падпалілі вёску. Дзьмуў вецер, будынкі былі крыты саломай — немагчыма было пагасіць пажар. Наша хата, хаця была крыта дахоўкай, усёроўна згарэла. Улады крыху выплацілі страхоўкі і трэба было нанава будавацца. Я ўжо быў жанаты, мой цесць меў свой лес, а гэта давала вялікую палёгку.

У 1968 годзе стаў я на працу на чыгунку; адначасна абрабляў зямлю. Пасля яшчэ звязаўся з беластоцкай „Цэпэліяй" і з жонкай працавалі дзень і ноч каб зарабіць вялікія грошы. У 1974 годзе запісаліся ў чаргу для пакупкі машыны і пасля года і васьмі месяцаў чакання атрымалі мы „Запарожац". Абрабляць тры работы было цяжка і я звольніўся з чыгункі і ў 1980 годзе перабраўся на жыхарства ў Гайнаўку.

З 1990 года хадайнічаю за кампенсацыяй за ўчыненыя нам у час вайны крыўды, але дагэтуль ніхто не збіраецца іх выпраўляць. Тыя, якія працавалі ў Германіі, атрымалі кампенсацыі ўжо другі раз, а пра нас, разагнанае і аголенае насельніцтва прыпушчанскіх вёсак, забылі...

Запісаў Віктар Бура

Гайнаўскія пенсіянеры

Такіх як гайнаўская арганізацыя Польскага саюза пенсіянераў і інвалідаў мала ў Падляшскім ваяводстве. Яна і шматлікая, і адна з самых актыўных. Усё гэта звязана з дзвюма асобамі: Мікалаем Чыквіным (шматгадовым старшынёю) і Тэрэсай Чарнэцкай (вядучай фінансавыя справы ды ўсё справаводства ў раённым аддзеле ПСПіІ).

Сёлета праўленне арганізацыі людзей „трэцяга ўзросту" кожны месяц арганізавала танцавальныя вечарыны спалучаныя з сустрэчамі з цікавымі людзьмі, з конкурсамі і іншымі атракцыёнамі, а таксама экскурсіі на Грабарку ды ў Такары. 26 верасня гайнаўскія пенсіянеры ездзілі ў прыгожае наваколле ля вадасховішча ў Рэпчычах — на развітанне з летам і адначасова свята печанай бульбы. На беразе 11-гектарнага вадасховішча расклалі касцёр, пяклі бульбу, танцавалі пад гукі гармоніка. А яшчэ хто схадзіў у лес па грыбы. Не забракла вудзільшчыкаў, якіх так і пацягнула да вады. Аказваецца, у Рэпчыцкім вадасховішчы карасі так і лезуць на кручок, абы падаць ім толькі прынаду. Вечарам сеніёры пераехалі ў Асяродак культуры ў Кляшчэлях, дзе танцавалі пры „жывой" музыцы, а не запісанай на касетную плёнку. Так гасцінна прынялі іх у сябе мясцовыя пенсіянеры ды кіраўнічка танцавальнага зала і буфета. Варта адзначыць, што на свята печанай бульбы ў Рэпчычы спецыяльна прыехала сакратар Гарадской управы ў Кляшчэлях Аліна Снарская. Такім чынам заадно кляшчэлеўскія пенсіянеры ладзілі супрацоўніцтва з гайнаўскімі.

Варта дадаць, што гайнаўскім пенсіянерам шмат дапамагаюць бурмістр Гайнаўкі Анатоль Ахрыцюк ды дырэктар ГДК Андрэй Скепка. У ГДК пенсіянеры ладзяць амаль усе забаўляльныя мерапрыемствы. Маюць яны таксама льготы ў плаце за карыстанне з памяшкання прызначанага на бюро ў адным з гайнаўскіх прадшколляў.

Янка Целушэцкі

З месячнага боку

Дарагая Домна! Што абазначае мой сон? Прыснілася мне многа-многа лебедзяў. Яны хадзілі па траве, побач нашай палявой дарогі. Мы разам з дачкю ішлі іх следам і ўсюды знаходзілі лебядзіныя яйкі. Мы збіралі іх у прыпол, а пасля клалі на адно месца ў траву (якое ўяўлялася як гняздо) — каб птахі выседжвалі маладых. Здарэнне адбывалася ў час майго дзяцінства, калі я жыла ў вёсы пад Гайнаўкай. Дарога ў сне — рэальная палявая дарога, па якой у час дзяцінства я гуляла з сябрамі і вясной збірала шчавель.

Вольга

Вольга! Твой сон азначае працу над адраджэннем, узнікненнем новага. Найбольш красамоўныя тут яйкі. Хопіць прыгадаць хрысціянскую сімволіку. Велікодныя яйкі — сімвал жыццёвай моцы і сілы, пачатак усяго. Відаць працу тваёй *псіхэ*, у цябе нешта пачынаецца, хаця яшчэ не відаць эфектаў. Звярні ўвагу, што тое, што робіш з дачкой мае земляробчы характар. Ёсць сувязь з зямлёй, расадай, павелічэннем. Яйкі тут як зерне, з якога маюць нарадзіцца новыя формы. У снах кантакт з зямлёй (тут трава) заўсёды мае вялікае значэнне. Думаю, што тут гаворка аб пераломе, аб жыццёвых зменах.

Варта звярнуць увагу на наваколле. Вёска з часоў дзяцінства — асвоеная прастора, з якой спалучаецца пачуццё бяспекі, месца кантакту з продкамі. Ёсць там твая дачка, якая ад цябе атрымала спадчыну. Сон ваш напамінае велікодныя дзіцячыя гульні.

Цяпер пра лебедзяў і іх яйкі. Лебедзі ў сонных гісторыях маюць пазітыўны сэнс. Сімвалізуюць цудоўную перамену, часам як у казцы пра брыдкае качанё — пераходны перыяд, каб у канцы стацца белым — лепшым. З другога боку — лебедзь можа абазначаць заключэнне-палон. Нейкія чорныя моцы замянілі чалавека ў лебедзя, каб не меў ён кантакту са светам людзей, але ён такім шляхам даб'ецца свайго, выйдзе на сваю дарогу. Ваша, тваё і дачкі, супрацоўніцтва, мае прынесці карысную змену; вы, дарэчы, ужо апынуліся на дарозе пазітыўных змен.

Домна

PS. У сувязі з вялікім зацікаўленнем сімволікай сну, прапануем нашым чытачам працяг рубрыкі „Вер-не-вер", якая цяпер і будзе называцца **„З месячнага боку"**. Лісты Домне слаць у рэдакцыю або па Інтэрнэтавым адрасе:

domnason@wp.pl

Недарэчны закон

Спатрэбіліся маёй дачцэ метрыкі дзяцей. Папрасіла ў мяне, каб з'ездзіў я за імі ў Гайнаўку. У ЗАГСе чыноўнік сказаў мне напісаць заяву ды ў касе купіць значкі казначэйскай аплаты. І вось, што я прыкмеціў. У шасцідзесятыя гады, калі я працаваў у такой жа канторы, аплата за метрыку была такая ж як і зараз — 10 зл. за выпіс з акта нараджэння, 15 зл. за скарочаны выпіс і 30 зл. за поўны выпіс. На метрыцы ставіўся штамп, што пасля праверкі, чыноўнік абавязаны метрыку вярнуць.

Зараз, у дэмакратыі і капіталістычнай гаспадарцы, думаецца адно — як ад чалавека выманіць грошы. Калі спатрэбіцца аформіць некалькі спраў у адной установе, напрыклад, у судзе, дык на казначэйскія аплаты ўсю зарплату трэба аддаць. І яшчэ адну недарэчнасць бачу ў нашым заканадаўстве — пісанне заявы, каб атрымаць метрыку. Гэты закон абавязвае ад 2000 г., — канстатуе кіраўнік Гайнаўскага ЗАГСу. — Нікому гэта заява непатрэбна, адно макулатуру збіраем ды шафы завальваем. За пяць гадоў (закон аб перахоўванні дакументаў) шмат непатрэбшчыны накапляецца. Нават на „бясплатныя" метрыкі трэба заяву пісаць, — дадае чыноўнік. Метрыку выдаем бясплатна, а на заяву трэба за 5 зл. марку наклеіць. На маю думку, метрыка з'яўляецца дакументам такім жа як пашпарт і ў канторах не павінны забіраць „арыгінала". Хапіла б зрабіць копію і за верагоднасць распісацца. Але тады дзяржаўны бюджэт не меў бы прыбытку. Таму, пэўна, нашы міністры фінансаў на такую здзелку не рызыкнуць.

Уладзімір Сідарук

Справаздачна-выбарны сход Таварыства дыябетыкаў

20 верасня адбыўся справаздачна-выбарны сход Раённага аддзела Таварыства дыябетыкаў у Гайнаўцы. Справаздачу з чатырохгадовай дзейнасці гэтай 180-асабовай арганізацыі зрабіў старшыня Лех Міхаляк. Кіраўніцтва арганізацыі перш-наперш арганізоўвала бясплатныя кансультацыі дыябетыкаў з лекарамі, іх агляд урачом, праверку крывянога ціску, сэрца ды ўвогуле як лячыць цукровую хваробу. Ладзіла паездкі ў санаторыі ў Цехацінку, Калобжэгу і Сверадове-Здрою. Заказвала павозку-амбуланс з лекарам для кансультацый з хворымі. Апрача таго арганізоўвала экскурсіі і паломніцтва ў Чанстахову і Ліхэнь. Таварыства распаўсюджвала таксама глюкаметры для вымярэння ўзроўню цукру ў крыві.

Падчас сходу былі выбраны новыя ўлады Таварыства дыябетыкаў. Старшынёю паўторна выбралі Леха Міхаляка, а намеснікамі старшыні — Анну Садоўскую і Малгажату Закшэўскую. Функцыю сакратара даверылі Тамары Енджаеўскай. У склад праўлення ўвайшлі Ірэна Шамборская, Ларыса Сапежка і Вітальд Лапінскі.

Рэвізійную камісію ўзначаліла Данута Людвічак.

Новае праўленне Раённнага аддзела Таварыства дыябетыкаў плануе арганізаваць гурткі ў Кляшчэлях і Нараўцы. (яц)

Фота ТАМАРЫ ПАЎРАШУК

На панадворку Дзядзькі Кваса

Міхась Красоўскі нарадзіўся ў 1904 годзе ў вёсцы Малынка непадалёк Заблудава. Цяжкое было ягонае дзяцінства. Падчас першай сусветнай вайны разам з бацькамі вымушаны быў падацца ў бежанства і свае маладыя гады правёў ў стэпах Ніжняга Паволжа.

Вярнуўшыся з бежанства шмат працаваў пры адбудове бацькаўшчыны — будаваў хату, гаспадарчыя будынкі ды карчаваў зямлю. Потым перасяліўся на хутар паміж Малынкаю і Каўпакамі, дзе па сённяшні дзень стаяць будынкі і абрабляе гаспадарку ягоная дачка Тамара з мужам Мікалаем.

Калі ў Беластоку стала выходзіць „Ніва", у хуткім часе пачаў у яе пісаць Міхась Красоўскі. Вельмі цікавыя былі яго фельетоны і сатырычныя вершы, а ў 1978 годзе паявілася ў „Ніве" яго ўласная рубрыка „Палоска Дзядзькі Кваса". Пісаў да апошніх гадоў свайго жыцця. Памёр 10 сакавіка 1985 года на 81-м годзе жыцця. Пахаваны на могілках у Пяценцы што каля Подваркаў.

Цікава цяпер зайсці на панадворак Дзядзькі Кваса. Там ад ранняй вясны да позняй восені панадворак упрыгожваюць кветкі, якіх даглядае спадарыня Тамара са сваімі дзеткамі. Сярод кветак стаіць вялікі камень у выглядзе кавальскага кавадла. Ці яго так выразала натура ці людская рука ў каменную эпоху? На маю думку, павінны гэтым зацікавіцца спецыялісты-геолагі. За здымку каля каменя-кавадла, Міхал — унук Дзядзькі Кваса.

Мікалай Лук'янюк

Падляшша малаком плыве

— Гэта як белы вугаль, — сказаў аб малацэ падляшскі віцэ-маршалак Кшыштаф Талвінскі ў час прэс-канферэнцыі, якая адкрывала інфармацыйную кампанію накіраваную да асоб звязаных з малочнай кааперытыўнай прадукцыяй: да членаў кааператываў і пастаўшчыкоў у рэгіёне. Справа перш за ўсё ў перакананні ведаў аб шанцах і пагрозах для малачарства пасля ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз. Ідэю праекта запрапанаваў Мечыслаў Суднік, міжнародны спецыяліст па гэтай галіне. Падчас кампаніі зацікаўленыя могуць даведацца м.інш. аб формах падтрымкі нізкатаварных гаспадарак, прадуцэнцкіх груп, малых гаспадарак і формах дапамогі маладым гаспадарам. Афіцыйна пачнецца яна ў канцы кастрычніка на Агульнапольскім форуме малачарскіх кааператываў у Райгродзе, пры ўдзеле міністра сельскай гаспадаркі і старшыні ірландскай сельскагаспадарчай палаты. Арганізаваны будуць кожныя два месяцы тэматычныя канферэнцыі пры ўдзеле запрошаных гасцей ды індывідуальныя прапагандысцкія акцыі.

На Падляшшы каля 60 тысяч гаспадарак займаецца прадукцыяй малака. Яно — лідэр у скупцы малака пералічваючы літр на гектар і на трэцім месцы (пасля Мазавецкага і Вармінска-Мазурскага ваяводстваў) па прадукцыі малака. Сярэдняя плошча гаспадарак, якія займаюцца гэтым — блізка 30 гектараў. У сярэднім адна гаспадарка трымае 16 кароў, намерваючыся пабольшыць гадоўлю.

Як падкрэслілі ўдзельнікі канферэнцыі, важна, каб перад уваходам Польшчы ў ЕС стварыць моцны малочны рынак. Шанц на гэта — яднанне кааператываў, хоць бы вакол ужо дзейнічаючых шматсуб'ектных суполак. Каля чатырохста дзейнічаючых у рэгіёне фірмаў, якія займаюцца малачарствам з рознымі арганізацыйна-праўнымі структурамі — гэта зашмат (каля 13 кааператываў), — сказаў віцэ-маршалак Талвінскі; найлепш, каб на Падляшшы былі дзве такія „цэнтралі". Пры нагодзе ўспомніў адну з найважнейшых праблем, з якімі змагаюцца сяляне — засуху:

— З засухай, на жаль, трэба навучыцца жыць. Думаць аб змене тэхналогій. Неабходна ствараць, напрыклад, штучныя арашальні.

Леташняя сярэдняя цана за 1 літр малака на Падляшшы: 0,83 злотых.

(холм)

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2004 r. upływa 5 grudnia 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na I kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Родныя краявіды: маладое дрэва выцясня старое

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

— Чаму бусел спыняецца і стае на адной назе?

— Каб праз хвіліну падумаць над чарговым крокам.

* * *

Вядомы сваімі правымі поглядамі Янка пайшоў запісацца ў СЛД. Здзіўлены старшыня партячэйкі распытвае пра прычыну такой нечаканай змены палітычнай арыентацыі.

— Учора звечара, — расказвае Янка, — вярнуўся я з забягалаўкі і хацеў легчы ў ложак, а там мая жонка кахаецца з суседам. Не хацеў ім перашкаджаць і пайшоў спаць у клуню. Гляджу, а там мая дачка даказвае з суседавым сынам. І гэта мяне так знервавала, што падумаў: „Пачакайце, а пабачыце, якога я вам заўтра сораму нараблю!"

* * *

— Столькі начытаўся я пра шкоднасць піцця гарэлкі, што рашыў пакончыць з гэтым!

— З піццём?

— З чытаннем.

* * *

— Як выглядае вяршыня засухі?

— Калі дрэўца бегае за сабачкам.

* * *

У час экзаменаў у пакойчыку сядзяць студэнты і час ад часу ўздымаюць тосты:

— За Андрэя! Каб здаў!

— Каб здаў!

Пасля некалькіх тостаў у пакой паказваецца зморaны Андрэй:

— Ну і што: здаў? — цікавяцца сябры.

— Здаў, толькі адной не прынялі бо мела крыху вышчэрбленую шыйку.

* * *

Дашкольнікі шпацыруюць у парку. Раптам адзін з іх усклікае:

— Пабачце: на дрэве сядзіць малады вавёрак!

— Не вавёрак, — папраўляе выхавацелька, — толькі вавёрка!

— Ну і вочы ў пані — з такой адлегласці адрозніць пол!

* * *

Малую Галю наведвае цётка.

— Ведаеш, цёця, — хваліцца малая, — нядаўна наша сучка прывяла пяцёра шчанят!

— Хіба гэта быў вам вялікі сюрпрыз?

— Яшчэ які! Мы нават не ведалі, што яна выйшла замуж.

* * *

Унукі пытаюць бабулю:

— Бабулька, ці ты ведаеш, адкуль бяруцца дзеці?

— Вядома: бусел забірае немаўля і прыносіць яго ў дзюбе.

Брацік штурхае сястрычку:

— Чуеш? Я гаварыў табе, што бабулька яшчэ не ўсвядомленая!

Адгаданка

1. частка вопраткі з манкетам, 2. вязкая маса з мукі, замешанай на малацэ, 3. краіна з Дамаскам, 4. краіна з Грозным, 5. сукупнасць эпічных твораў.

(Ш)

Рашэннем адгаданкі будзе слова ў светлай калонцы. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Рашэнне адгаданкі з 34 нумара

Мілае дабро, але бруха адно.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Мікалаю Раманчуку** з Гайнаўкі.

1				
2				
3				
4				
5				

Прэзідэнт

Мядзведзь Сандар Жоржавіч зранку заўзята качаўся ў сваёй бярлозе, надоўга да ўселяснога сходу. І заснуць было цяжка, і прачынацца стаў рана. Гэта былі адзнакі, здаецца, блізкай старасці. Тым больш, што на сваім падбароддзі звочыў срэбныя валасіны, і на макаўцы паявілася штосьці накшталт залысінак. Яшчэ крыху, і на выбарчыя плакаты трэба будзе ставіць старыя, выдзеўбаныя Стукачом у дубовай кары партрэты. А выбірацца ж трэба будзе. Мінае, вось, трэці тэрмін ягонай улады. Што нам нетутэйшыя законы! Не наша дзела, як казаў Патап Мікітавіч, Сандараў дзед, тыя палітычныя выкрунтасы. Тутэйшая канстытуцыя была больш сучаснай нават ад Секвойскай, не кажучы ўжо аб Баабабнай. Тым больш, што, у прынцыпе, ніякі ён не прэзідэнт, а старшыня ўселяснога сходу — галоўнай дзяржаўнай рады. Хоць паўнамоцтвы ў яго, што ні казаць, прэзідэнцкія. Ды тут панараблялася гэтых прэзідэнтаў — за кожным кусцікам сядзяць, ледзь пару падуладных ці звычайных работнікаў пад імі, а ўжо, гляньце — прэзідэнт! Нават Сандару Жоржавічу гэтак даводзілася да іх звяртацца. Найбольш бойкі з іх — сваяк зайца Геніка, ціхманага сябры ўселяснога сходу, Зай Гамолка, і гэты вельмі ж нервуе Сандара Жоржавіча. Такое малое, хваста ў жменю не ўхопіш, а скача!.. Дырэктар кааператыва „Наш заечы шчавель". Прэзідэнт!.. Кажа, калі што, дык са шчаўя на кару пераб'юцца, а выжывуць, зайцы гэныя! Здасіся, шарсцюк! Уперыць засранцаў падаткамі, камісіямі, перарэгістрацыямі, кантролямі, не выпускаць тутэйшы шчавель за мяжу!.. Не будзе тут дзыгаць якісьці там Зай! І яшчэ бартэрнага гандлю захацелася! За добры шчавель навязуць нейкай поскудзі, расхваляць яе, і лясная брацыя як дурная мяняе свой традыцыйны густ!.. Мядзведзь аж засоп ад злосці. Аддыхаўшыся, пашлэпаў на паляну.

— Аціхнуць і слухаць! — узняў лапу мядзведзь. — Мой загад. Адмяніць усе тытулы гэтых самых... кіраўнікоў... Каб не было ні аднаго прэзідэнта ў нашым лесе.

— А вы? — вылупіла вочы вавёрка.

— А вы, Кацюша, у палітыцы не разбіраецеся? У прынцыпе я — народна абраны прэзідэнт, і гэтак мяне народ узвышае. А тытул у мяне тутэйшы. І народ мяне выбярэ няраз яшчэ. Такія ў нас правы, найбольш сучасныя. Калі не, дык ухвалім ды падпішам. Мабыць, царом патомным мне нельга пакуль быць, дык хай будзе Вялікі князь. Але прэзідэнтаў у нас больш быць не можа. Стукач, адстукайце на бярозавай кары што трэба. А вы, Генік, на адным дыху — адразу да свайго брата-багацея, паведаміць, што за парушэнне закону наступіць канфіскацыя ўсяго шчаўя і бартэрнага тавару. Дарэчы, здаецца, пастанова гаспадарчага суда з заўтрашняй датай ужо гатова. Не лупіцеся, зай, на наша вялічаства. Хопіць вам дзерці скуру з лясное брацыі. Дывідэнды! Трэнды! Хярэнды!

Заяц Генік апусціў вушы.

— Ы-ы-гм. Шчавель жа ж... нічога такога. Наша лясное багацце... А мы, зайцы, дык хоць на гэтым заробім крыху...

— У вас, Генадзь, дэпутацкая дыета. А гэтых... кааператыўшчыкаў... самазванцаў... я іх! — Сандар Жоржавіч аж пакаціўся на мох ад хвалявання.

— Ваша рацыя, шаноўны наш прэзідэнт! — спалохалася Кацюша і захвалявала над старшынёй кіраўніцтва сваёй пышнай кітай.

— Кацька! Азадкам да прэзідэнта!? Цьфу! — прачухаўся Сандар Жоржавіч.

Бен Гуйвін

Гарачая Верка

Познім вечарам пазваніла мне Агаціна сяброўка, якую занесла ветрам аж у Швецыю. Як занесла дваццаць гадоў таму, так і не прынесла, не вярнулі яе адтуль на радзіму халодныя вятры. (Тут мне пахаладзела ў нутры, бо што, калі і Агату звее мне з-пад носа нейкі цыклон ці як яму там, што над Амерыкай бушуе?..). Там і засталася была гарачая Верачка, абагравацъ нейкага старога халоднага шведа. А цяпер, вось, за маладзейшага выйшла. І ўжо так не нервуюся, калі са мною нават па тэлефоне размаўляе. Бо ў той Верачцы, пэўна, праз яе касыя крыху вочы, ёсць штосьці такое, быццам яна ўсё заігрывае. Нават я адчуваю сябе тады няўпэўнена. А што казаць пра чужых мужчын, не калег ці добрых знаёмых? Могуць палічыць цётку за какетку, альбо нават і паверыць, што гэтая нестарая брунетачка, незахудая, іх упадабала. Проста з Верчыных маленькіх карых вочак струменіць сексуальнасць. А гэта падзейнічала, бачыце, нават на таго маладзейшага на ледзь не дваццаць гадоў мужчыну з халоднае краіны...

А тут Верка мне звоніць:

— Еду да вас, чакайце, заўтра буду!

— Агаты дома няма, — адбіваюся вяла. — Я сам адзін застаўся... Ты адна, без чалавека, збіраешся?

— А то і добра, будзе больш месца для мяне. Мой Гунар мяне выслаў, каб хату купіць. Падкажаш мне, што і як.

— Якую хату? Вы што, збіраецеся жыць у Польшчы?

— Купіла я кавалак грунту на Сувальшчыне, хату трэба там паставіць. Ды старую, адно каб добрая была, з добрае драўніны...

— А не лепш новую збудаваць? Грошай жа ж у цябе там у той Скандынавіі, як лёду.

— Можна і было б, але суседзі ў вёсцы зайздросціць будуць. Яшчэ хто возьме ды спаліць. А хто будзе пільнаваць новую хату, пакуль нас не будзе? Паставіш не лепшую, чым у іншых, дык спакойна спіш. Ці там у вас, ці ў нас — тое ж. Народ завідлівы. Вандал, ты там разгляньcя па вёсках, па аб'явах... Колькі там каштуе такая халупа? Пяць тысяч хопіць?

— А хто яе ведае? Хат у нас пакінутых дастатак, толькі што не кожную прадаць можна. А што, заўтра будзеш? Дык разам разгледзімся.

А ў душы неспакой. Я нават пры Агаце адчуваю сябе няёмка, калі тая Верка свёрліць душу сваімі слепачкамі, да таго ж і за словам у кішэню не лезе. Як скажа, дык нібы кіпнем цябе хто абліў. Усё з несумненным падтэкстам. Але гэта смешна, бо ж Верку добра ведаю, і тыя шматзначныя слоўцы гэта толькі жарт. Не дарма яна — перакладчыца...

Усю ноч сядзеў я ў Інтэрнэце на старонках з аб'явамі. Прадаваліся хаты на перанос, і нямала. Нават і танна. Сапраўды, хапала і 5-8 тысяч злотых.

Прывітаў я Верку нявыспаны. Змарнелы з выгляду, мабыць, бо ў гэты раз не падчапляла мяне ні словам, ні жэстам. А, можа, той малады муж, хоць з халоднае краіны, узяў сабе ўсю Верчыну іскру? Я нават трохі і пакрыўдзіўся. Магла б крыху пажартаваць, так ці не?

Ніякія тут табе не жарты. Паехалі мы па вёсках. У Навасадах упадабалі адну хату. Роўна за 5 тысяч. Дамовіліся сустрэцца з уласнікам, практычна на барыш.

— Не куплю я хаты, — паведаміла апаўдні наступнага дня Верка са зззяючым тварам. — На базары па Юравецкай купіла сабе норкавае футра. Роўна за пяць тысяч!

Вандал Арлянскі

ISSN 0546-1960